№ 12 (370) 26 сакавіка 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы




**Джын дэмакратыі**

павернецца супраць Злучаных Штатаў?

старонка 3

**Гэта ня наш спорт**

Біятлён у прыцэле спэцслужбаў.

старонкі 4–5

**Бібліятэка Лявона Баршчэўскага**

Мэмуары Маўна Койвіста.

старонка 7

**Подзьвіг невядомае курыцы**

здольны зьмяніць імідж краіны.

старонка 16



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Гісторыя зноў дала шанец

**Прыме ці адкіне ўрад прапановы Эўропы і ЗША? Ці «пакрокавая стратэгія нармалізацыі адносінаў» прывядзе да зьмены замежнага вэктару беларускае палітыкі і ўнутранае дэмакратызацыі?**

**Адказы з боку ўладаў Беларусі прагучалі супярэчлівыя. Урал Латыпаў адмовіўся ад сустрэчы з эўрапейскім і амэрыканскім эмісарамі. Зь іншага боку, МЗС прывітала заходнія ініцыятывы. А пільныя сілавікі загадзя распачалі супраць лідэраў апазыцыі крымінальныя справы.**

**Апазыцыйны «ценявы кабінэт» безумоўна прыняў бы прапазыцыі Захаду. Прыняў бы, калі быў бы ва ўладзе. А пакуль пэрспэктыва нармалізацыі адносінаў краіны з цывілізаваным сьветам пэўныя колы ў апазыцыі палохае. Бо замірэньне пацягне за сабою адклад доўгачаканага «Акту аб дэмакратыі ў Беларусі». А перадусім жадаецца, каб заслуга інтэграцыі з Эўропай цалкам належала ўраду дэмакратычнаму — калісьці ж ён будзе абраны! І яшчэ больш — Лукашэнку ня вераць. «Усё адно падмане», — як у той памятнай апазыцыйнай афішцы.**

Працяг на старонцы 2.

## Арэнда на 99 гадоў. Але ня купля-продаж

Праект новай рэдакцыі Зямельнага кодэксу прадугледжвае магчымасьць атрыманьня зямельных надзелаў у арэнду на тэрмін да 99 гадоў. Землеўласьнікі змогуць прадаваць гэтае «вечнае права арэнды», закладаць яго для атрыманьня крэдытаў у банку. Калі праект будзе прыняты, Беларусь зробіць этапны крок наперад у рынкавых рэформах — да фармаваньня зямельнага рынку.

Яшчэ законапраект, апроч існага ўжо плацяжу за зямлю, уводзіць плату за яе арэнду. Плаціць гэты падатак, паводле праекту новага кодэксу, давядзецца і дачнікам, і вяскоўцам. Памеры плацяжоў, прывязаныя да базавай адзінкі, будуць зацьвярджацца Саўмінам з улікам асаблівасьцяў рэгіёну, а таксама льготаў і прэфэрэнцыяў.

Дэпутат Васіль Хрол, старшыня парлямэнцкай камісіі па прыватызацыі, адзначае, што аб'ектам куплі-продажу зямля пакуль быць ня можа, бо супраць гэтага прагаласавала большасьць на рэфэрэндуме 1996 г.

«Зь зямлёй — як і зь сьмяротным пакараньнем, — сказаў, камэнтуючы для «НН» праект, пісьменьнік Адам Глёбус. — Нельга чалавека крышку забіць. Таму арэнда — падман. Мусіць быць права на куплю-продаж зямлі, мусіць быць маё і чужое. Калі б Лукашэнка на такое наважыўся, ён забясьпечыў бы сабе трэці тэрмін».

**СМ; БелаПАН**

**Падпіска падоўжаная — і найтаньнейшая!**

«Белпошта» і «Белсаюздрук» падоўжылі тэрміны падпіснай кампаніі на другі квартал да 25 сакавіка. Дык скарыстайцеся!

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця.

«Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова штотыдзень.

Газэта была заснаваная ў 1906 годзе, адноўленая ў 1991 годзе. Пасьля аднаўленьня выходзіць ужо 13 гадоў.

Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта абыдзецца нашмат таньней, чым купляць уроздроб.

# Гісторыя зноў дала шанец

Працяг са старонкі 1.

**Калі Пайфэр і Джонз былі ў прысутнасьці журналістаў стрыманымі, дык нямецкі пасол Фрык у сераду, напярэдадні адкрыцьця беларуска-нямецкага форуму, выказаўся без эківокаў: «Эўрапейскі Зьвяз і Злучаныя Штаты працягваюць сваю руку Беларусі, і яны адзіныя ў сваёй пазыцыі, маюць супольнае меркаваньне. Яны працягваюць руку Беларусі для пашырэньня супрацоўніцтва ў розных сфэрах — палітычнай, эканамічнай, культурнай. Такога супольнага дэмаршу на высокім узроўні з працягнутай да Беларусі рукой з боку Эўразьвязу й ЗША ў мінулым яшчэ не было. Мы спадзяёмся, што гэтая працягнутая рука будзе прынятая, а не адрынутая».**

**Захад трохі выглядае кавалерам без пачуцьця ўласнае годнасьці. Яму колькі разоў у зьняважлівай форме адмаўлялі, а ён усё набіваецца. Лукашэнкаўцы ўмеюць падманваць Захад, як абвялі вакол пальца пяць гадоў таму першага міратворца, пасла Віка.**

**Прыняцьце прапановы Захаду і абавязкі, якія з такога прыняцьця вынікаюць, рызыкоўныя для палітычнай будучыні лукашэнкаўскае эліты. Яна мае іншую жыцьцёвую філязофію, засвоіць новую палітычную культуру ёй цяжка, калі ўвогуле магчыма. Дый гаспадарчая мадэль — хоць на яе на Захадзе, у адрозьненьне ад Усходу, ніхто не замахваецца — нягледзячы на ўсе посьпехі, што так захапляюць заходніх аналітыкаў, запатрабавала б перабудовы хутчэй. Рэзкія рухі такой старэчы супрацьпаказаныя. Зрэшты, з гаспадаркай так і так трэба нешта рабіць пры пераглядзе беларуска-расейскіх адносінаў.**

**Прыняцьце было б рызыкай, але не самагубствам. Вось чаму ёсьць доля імавернасьці, што працягнутая Захадам рука ня будзе адрынутая. Гэта, прынамсі, давала б лукашэнкаўцам і шанец на новую палітычную й ідэалягічную пэрспэктыву ва ўмовах, калі праект інтэграцыі з Расеяй пацярпеў крах зь незалежных ад інтэгратараў прычынаў. Шанец не такі й прывідны, як гэта шмат каму падаецца. Некаторыя краіны гадамі дабіваюцца такіх прапановаў, якія прагучалі з боку Эўропы і Амэрыкі. Незалежнасьці Беларусь дасягнула нечакана для самой сябе. Хто б зьдзівіўся, калі б эўраінтэграцыя звалілася на краіну, як сьнег на галаву?**

**Можна доўга гадаць, чым абярнулася б прыняцьце прапановаў. Затое няма сумневаў, чым было б непрыняцьце і працяг самаізаляцыі на міжнароднай арэне. Злачынствам. Чарговым з Лукашэнкавага боку злачынствам супраць нацыянальных інтарэсаў.**

**Барыс Тумар**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**«Беспрэцэдэнтны візыт» памочніка дзяржсакратара ЗША Стывэна Пайфэра і дырэктара па справах Усходняй Эўропы, АБСЭ і Рады Эўропы МЗС Ірляндыі Барбары Джонз, якая прадстаўляла Эўразьвяз, пачаўся з ускладаньня кветак да магілы народнага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава на Ўсходніх могілках.**

## Тэлевізар таксама шкляны

Кіраўніком Белдзяржтэлерадыёкампаніі прызначаны Ўладзімер Матвяйчук. Раней ён займаў пасаду намесьніка па ідэалёгіі й кадрах ААТ «Полацак-Шкловалакно» ды быў прадстаўніком дзяржавы ў назіральнай радзе гэтага акцыянэрнага таварыства. «Шкловалакно» — адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў краіны. Як і ў выпадку з Кіраўніцтвам справаў, новы кіраўнік — чалавек з боку, нязьвязаны з сталічнымі ўладнымі групоўкамі. І таксама асабісты знаёмы — вучыўся разам з Лукашэнкам.

**Сяргей Мікулевіч**

## Ліцэісты сьвяткавалі

Навучэнцы Гуманітарнага ліцэю зладзілі акцыю да Дня Волі. Каля 60 ліцэістаў сталі ў сераду ўздоўж праспэкту Скарыны, сьпяваючы «Гаўдэамус» і трымаючы ў руках плякаты і балёнікі. Хвілін праз трыццаць міліцыянты затрымалі бацьку ліцэіста Юр'я Грыневіча, які рабіў фатаздымкі. Далей ліцэісты накіраваліся ў парк Горкага, дзе малявалі на асфальце ліцэйскія лёзунгі. Там міліцыя затрымала васьмёх юначак: Адэлю Дубавец, Юлю Бандарэнку, Вольгу Кавалёву, Марылю Васючэнку, Тацяну Абрамчук і яшчэ трох дзяўчынак, якія проста назіралі за пэрформансам. Усіх неўзабаве выпусьцілі.

**Аркадзь Шанскі**

## Добра!

У Глыбокім адкрыўся бар, шыльда на якім зроблена на тарашкевіцы, — «Клюб выдатнага гумору «Добра». Гэтая ідэя прыйшла ў галаву мэнэджэру Валер'ю Хамякову пасьля таго, як БТ пачало трансьляваць навіны па-расейску. Ён патэлефанаваў на БТ, але яму запярэчылі, што сярод падаткаплатнікаў ёсьць і расейскамоўныя. У плянах кавярні — праводзіць тэматычныя вечарыны, запрашаць паэтаў, пісьменьнікаў, бардаў, гумарыстаў. Асабліва сымпатычная рыса бару — адсутнасьць моцных напояў. Прадаецца толькі піва, прычым выключна рэчыцкіх вытворцаў, якога няма больш нідзе ў рэгіёне. Назва клюбу — «Добра» — тлумачыцца тым, што, паводле падлікаў мэнэджэраў, гэта слова глыбачане ўжываюць найчасьцей. Шмат хто зьвязвае беларускую мову з тым, што яна шкодзіць бізнэсу, аднак апісаны выпадак даводзіць адваротнае: глыбоцкае прадпрыемства аказалася пасьпяховым.

**Зьміцер Лупач, Глыбокае**

# РЭПка выйшла сама

**Шэрагі Канфэдэрацыі незалежных прафсаюзаў могуць вырасьці да 15 тысяч чалавек.**

Фэдэрацыю прафсаюзаў Беларусі пакінуў прафсаюз работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці (РЭП) — апошняе галіновае прафаб'яднаньне з самастойнай пазыцыяй. Назіраючы за тым, як козікаўская ФПБ адхілілася ад кіраўніцтва А.Ярашука ды А.Бухвостава, РЭП пайшоў на апераджальны крок, выйшаўшы са складу Фэдэрацыі.

Праўда, ФПБ пасьпела расьцягнуць сяброў РЭП. Паводле зьвестак прэс-службы ФПБ, на 1 студзеня 2003 г. у прафсаюзе РЭП на ўліку стаяла 40 тысяч чалавек, аднак за год колькасьць членаў РЭП скарацілася ў 40 разоў. Старшыня РЭП Генадзь Фядыніч называе іншыя лічбы. Паводле ягоных словаў, у РЭПе цяпер 3 тысячы сябраў, а разам з АСМ стане каля 5 тысячаў.

17 сакавіка паседжаньне прэзыдыюму прафсаюзу аднагалосна выказалася за пераход у вольнае плаваньне. Цяпер да прафсаюзу РЭП мяркуюць далучыцца незарэгістраваны Незалежны прафсаюз работнікаў аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудаваньня (АСМ) на чале з Аляксандрам Бухвоставым і частка галіновага прафсаюзу мэталістаў. Пазачарговы зьезд РЭП скарэктаваў свой статут, увёўшы пасаду сустаршыні, і зьмяніў назву на РЭПАМ — прафсаюз работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці, аўтамабілебудаваньня, мэталаапрацоўкі ды іншых галінаў народнай гаспадаркі. Зьмены ў статут знаходзяцца на рэгістрацыі ў Міністэрстве юстыцыі. Калі рэгістрацыя адбудзецца, аб'яднаны прафсаюз РЭПАМ з колькасьцю штыхоў да 5 тысячаў можа ўліцца ў Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП). Але «кіраўніцтва ФПБ усялак супрацьдзейнічае рэгістрацыі зьменаў у статуце РЭП», — скардзіцца А.Бухвостаў.

Сам БКДП цяпер яднае прыкладна 10700 чалавек. У Кангрэс уваходзяць Незалежны прафсаюз гарнякоў і транспартнікаў (Салігорск) колькасьцю 6,5 тысячы чалавек, Свабодны прафсаюз Беларускі — 2,5 тысячы чалавек, Незалежны прафсаюз мэталістаў і Дэмакратычны прафсаюз транспартнікаў — кожны па 800 чалавек.

Трэба адзначыць, што СПБ на чале з Генадзем Быкавым прыпыніў сяброўства ў БКДП у сьнежні 2003 г. пасьля пазбаўленьня СПБ права голасу ў радзе Кангрэсу за няўплату цягам апошніх двух гадоў сяброўскіх унёскаў.

Больш за месяц Мінюст дасканальна правярае прафсаюзы, што ўваходзяць у БКДП. «Нас хочуць калі не ліквідаваць, дык аслабіць», — кажа віцэ-прэзыдэнт БКДП Мікалай Канах. БКДП рыхтуецца паведаміць пра факты ўціску спэцыяльнай камісіі па дасьледаваньні правоў працоўных Міжнароднай арганізацыі працы, якая мае наведаць Беларусь 15—23 красавіка. Да лістапада камісія падрыхтуе даклад пра сытуацыю ў Беларусі Адміністрацыйнай радзе МАП. Калі камісія пацьвердзіць факты парушэньняў, беларускі ўрад можа абскардзіць рашэньне МАП у Міжнародным судзе ў Гаазе (такое здараецца надзвычай рэдка) або пагадзіцца з вывадамі камісіі і абавязацца да канкрэтнай даты ліквідаваць усе недахопы. Інакш краіну чакаюць эканамічныя санкцыі.

Прафсаюз РЭПАМ добра ўмацаваў бы БКДП. Ня толькі сябрамі — да аб'яднанага прафсаюзу блізкая газэта «Рабочая солидарность». Аднак у прафсаюзах разумеюць, што да злучэньня ім прыйдзецца вытрываць чарговую атаку ўладаў.

**Рыгор Буян**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Старшыня РЭПу Генадзь Фядыніч**

Пікет РЭПу супраць пераводу працоўных на кантрактную сыстэму адбудзецца на пл.Ванеева ў пятніцу, 26 сакавіка, а 16-й гадзіне.

## ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пераход на летні час

28 сакавіка а 1.00 трэба перавесьці стрэлкі гадзіньнікаў на гадзіну наперад.

### Меней п'юць

Гарэлкі ў студзені—лютым 2004 г. прададзена на 15% меней проці 2003 г. На 26,8% меней прадалося вінных пладовых напояў. Адначасова на 0,5% павялічылася рэалізацыя пладовых вінаў, на 3,3 — каньяку, на 5,3 — вінных вінаградных напояў, на 5,8 — піва, на 32,2 — вінаградных вінаў, на 32,6 — шампанскага. У цэлым збыт алькагольных напояў і піва зьменшыўся на 4,2%, хоць вытворчасьць вырасла на 10%.

### Незвычайна сьнежная зіма

Сярэдняя тэмпэратура зімы была на 1,6 градуса ніжэйшая за норму. Ападкаў за зіму выпала ў сярэднім 179 мм, ці 156% нормы. Такой колькасьці ў краіне за апошнія 60 гадоў не выпадала. Вясна насоўваецца надзвычай хутка. 18 сакавіка ў Берасьці было +18°С, а па поўдні краіны пранесьліся першыя навальніцы.

### «Аляксандра і Канстанцін» другімі

На «Эўрабачаньні'2004» «Аляксандра і Канстанцін» будуць выступаць пад другім нумарам. Першы атрымаў фінскі сьпявак. Кінулі жэрабя і на фінал, які адбудзецца 15 траўня. Калі «А&К» туды трапяць, будуць сьпяваць у найлепшым выпадку пятымі.

### Замалявалі фрэску Пушкіна

У царкве мястэчка Бобр белым замаляваная знакамітая фрэска, што выяўляе двух пэрсанажаў, падобных да Лукашэнкі і мітрапаліта Філарэта, у пекле. Сьвятар адмаўляецца нешта тлумачыць. Мастак зьвязвае гэта з рэпартажамі пра выяву на расейскіх тэлеканалах.

### Ці стане ірляндзкая афіцыйнай

Ірляндзкая партыя «Шын фэйн» у пятніцу зноў зьвярнулася ў Эўразьвяз з просьбай зрабіць ірляндзкую мову адной з афіцыйных моваў ЭЗ. Гэта, на думку лідэраў партыі, паклала б канец канфлікту ў Ольстэры. Заяву выклікала публікацыя на сайце ЭЗ інфармацыі на 10 афіцыйных мовах Зьвязу. Па-ірляндзку там няма ані слова.

### Левая альтэрнатыва СДПГ

Нямецкая лявіца, расчараваная нэалібэральным курсам канцлера Шродэра, закладае Ініцыятыву за працу і сацыяльную справядлівасьць. Новы рух, які разьлічвае на падтрымку прафсаюзаў і людзей зь левымі поглядамі, гатовы выступіць на выбарах 2006 г. канкурэнтам СДПГ. Кіраўніцтва СДПГ палохае сябраў руху выключэньнем з партыі. Рэйтынг партыі Шродэра апусьціўся да рэкордна нізкага ўзроўню 22—24%.

**СМ**

# Вызваленьне джына

Віталь Тарас



PHOTO.BYMEDIA.NET

Летась, у ноч з 19 на 20 сакавіка, мяне абудзіў тэлефонны званок. Пакуль я зь цяжкасьцю разьляпіў вочы, пакуль падняўся, пакуль намацаў тэлефон, ён перастаў зьвінець. На гадзіньніку было каля трэцяй. І тут я зразумеў: гэта ж сыгнал! Трэба тэрмінова ехаць на працу, рабіць навіны. Тая самая вайна ў Іраку, пра якую ўвесь час гаварылі Буш-малодшы й кампанія, пачалася.

Першыя некалькі гадзінаў, а потым і дзён інфармацыі з тэатру баявых дзеяньняў амаль не было. На экране Сі-Эн-Эн амаль увесь час можна было бачыць адно бязьлюдную пустыню й танкі з бэтээрамі на маршы. У тую вайну была зроблена адна вынаходка. Журналістаў вядучых амэрыканскіх кампаніяў прыкамандзіравалі да амэрыканскіх марпехаў і ў літаральным сэнсе пасадзілі на браню. Лепшага спосабу ваеннай цэнзуры й не прыдумаеш. (Калі не лічыць, вядома, стрэлаў наўпроставай наводкай з танкавай гарматы ў прэсавы цэнтар.)

Журналіст на перадавой лініі папросту ня ў стане ацаніць стратэгію вайсковай апэрацыі ў цэлым ці нават скласьці аб'ектыўную карціну таго, што адбываецца. Ён свайго роду закладнік, толькі не тэрарыстаў, але айчынных жаўнераў ды афіцэраў, ад якіх залежыць жыцьцё журналіста. Усё, што тычыцца не эмоцыяў, але менавіта інфармацыі, даводзіцца атрымліваць з рук камандаваньня ці афіцыйных асобаў. Амэрыканскія гэта асобы ці ірацкія, насамрэч вялікага значэньня ня мае.

Заявы міністра інфармацыі Іраку Саіда аль-Сахафа былі разнастайнымі й нечаканымі, нават парадаксальнымі, за што яго палюбілі тэлежурналісты дый проста тэлеглядачы. Калі сілы саюзьнікаў захапілі Міжнародны аэрапорт у Багдадзе, міністар заявіў, што гэтыя сілы акружаныя й павінныя здацца, «інакш яны ня выжывуць». Паводле яговых словаў, ірацкія войскі рыхтуюцца да «нестандартнай і неваеннай атакі», што паслужыць агрэсарам «цудоўным урокам». Прынамсі, гэта гучала больш нестандартна й вынаходліва, чымся надакучлівая інфармацыя аб тым, што войскі кааліцыі вось-вось перасякуць «чырвоную мяжу» пад Багдадам, пасьля чаго Садам Хусэйн нарэшце абавязкова скарыстаецца сваёй сакрэтнай зброяй масавага зьнішчэньня.

Можна сёньня колькі заўгодна сьмяяцца з ірацкага міністра інфармацыі. (Хаця я асабіста сумняюся, каб хто-небудзь з айчынных міністраў падобнага профілю ў выпадку вострага крызысу пайшоў бы да журналістаў пад кулі й бомбы.) Можна іранізаваць зь няўклюдных апраўданьняў амэрыканскага камандаваньня наконт «мінімізацыі стратаў сярод цывільнага насельніцтва» альбо «прыцэльнага бамбакіданьня». Расейскія, а ўсьлед за імі й беларускія СМІ менавіта гэтым займаліся, аж пакуль Багдад ня здаўся на ласку пераможцаў, можна сказаць, без адзінага стрэлу. Вайсковая моц аднаго з самых грозных на Ўсходзе рэжымаў аказалася такім самым блефам, як і адданасьць іракцаў свайму правадыру — за яго на апошніх выбарах аддалі галасы амаль 100% грамадзянаў.

Шок, выкліканы падзеньнем сяброўскага дыктатарскага рэжыму, быў такім моцным, што ні масавае марадзёрства й рабаваньне музэяў у Багдадзе, ні цяперашнія крывавыя тэракты, на якіх акцэнтуюць увагу сродкі дзяржаўнае прапаганды, не дапамаглі ім узяць рэванш. Шок не прайшоў дагэтуль. Ня тое каб афіцыйны Менск моцна напалохала гісторыя з факсам, знойдзеным у ірацкай пустыні, які нібыта даказвае факт паставак беларускіх узбраеньняў Хусэйну. «Тоны папераў» з доказамі вайсковага супрацоўніцтва Багдаду зь Менскам і Масквой, якія абяцалі паказаць на ўвесь сьвет ірацкія апазыцыянэры, так і ляжаць недзе бяз руху, калі ўвогуле захаваліся. Але ж і ўявіць сытуацыю накшталт высяленьня амэрыканскае рэзыдэнцыі з Драздоў, як гэта было за некалькі гадоў да вайны ў Іраку, цяпер даволі цяжка.

Аднак гэта ўсё дэталі. Застаюцца некалькі кардынальных пытаньняў. Ці апраўданая была вайна ў Іраку? Адказ у кожным выпадку будзе неадназначны, калі ўвогуле магчымы. Што тычыцца зброі масавага зьнішчэньня, дык у наяўнасьці яе ў Хусэйна сумняваліся ня толькі ў Бэрліне й Парыжы, але, напэўна, і ў самой адміністрацыі Буша, ня кажучы пра брытанскі Форын Офіс.

Перад самым пачаткам вайны ў адной зь нямецкіх газэт было зьмешчанае інтэрвію выдатнага польскага пісьменьніка Станіслава Лема. Галоўны ляйтматыў таго інтэрвію быў: «На Багдад!» А ў абгрунтаваньне гэтай пазыцыі прыводзіўся той факт, што, калі б саюзьнікі ў 1945-м вагаліся, ці трэба ўводзіць войскі ў Нямеччыну, Гітлер яшчэ вельмі доўга заставаўся б ва ўладзе. І пытаньне, наколькі былі блізкія нямецкія навукоўцы да стварэньня ядравай зброі, мела тады другаснае значэньне.

Падобную пазыцыю выказвалі год таму ў прэсе многія ўсходнеэўрапейскія інтэлектуалы, вядомыя ў мінулым дысыдэнты. Яны кіраваліся ў сваіх развагах найперш маральным фактарам: трэба пазбавіць ірацкі народ крывавага дэспата. Усё новыя масавыя пахаваньні дзясяткаў тысяч забітых мірных жыхароў, якія знаходзяць у Іраку, сьведчаньні катаваньняў, гвалту і зьверстваў памагатых Садама ня скінеш з рахунку. Як ня скінеш з рахунку і відавочных разьлікаў Вашынгтону на выкарыстаньне ў будучым у нацыянальных, у тым ліку чыста фінансавых, інтарэсах ірацкае нафты.

> Дэмакратыя — гэта свайго роду джын, якога выпусьцілі з бутэлькі. А тэрарызм ёсьць платай за свабоднае жыцьцё.

Чаму Вашынгтон палічыў за лепшае ўзяць на ўзбраеньне не барацьбу з дыктатарскім рэжымам, а праблему зброі масавага зьнішчэньня, якая патэнцыйна магла апынуцца ў руках дыктатара ці тэрарыстаў, — зразумець можна. Толькі гэтая праблема магла быць дзейсным рычагом нацыску на ААН. У гэтай арганізацыі прадстаўленыя, сярод іншых, рэжымы, падобныя да садамаўскага. Прынамсі, пастаянныя сябры Рады Бясьпекі Кітай і Расея ў самую апошнюю чаргу заклапочаныя парушэньнем правоў чалавека дзе б там ні было.

Наколькі менавіта такая пастаноўка пытаньня Злучанымі Штатамі ў ААН была эфэктыўнай з гледзішча міжнароднай маральнай падтрымкі — пакуль да канца не зразумела. Ва ўсялякім выпадку, выбухі ў Мадрыдзе, што прывялі да зьмены гішпанскага ўраду і непазьбежнага ў будучыні вываду гішпанскіх войскаў з Іраку, прымушаюць па-новаму паглядзець на падзеі нядаўняга мінулага. Калі амэрыканская адміністрацыя сапраўды ставіла на мэце барацьбу зь міжнародным тэрарызмам у цэлым і Аль-Каідай у прыватнасьці, то выглядае, што вайна ў Іраку вырашэньню гэтай задачы паспрыяла не найлепшым чынам.

Дый Польшча, якая паставіла на карту вельмі многае, але падтрымала ЗША ў ірацкім канфлікце, не зважаючы на крытыку такіх грандаў аб'яднанай Эўропы, як Нямеччына й Францыя, няшмат набыла. Нядаўні візыт прэзыдэнта Квасьнеўскага ў Вашынгтон у Польшчы быў прызнаны няўдалым з пункту погляду эканамічных прэфэрэнцыяў, на якія разьлічвала Варшава перад вайной у Затоцы. Як зазначыў адзін амэрыканскі паліттэхноляг, які нядаўна наведаў Менск, падтрымка ЗША з боку нейкай краіны ў нейкай канкрэтнай сфэры, напрыклад у вайсковай апэрацыі ў Іраку, яшчэ не азначае, што Злучаныя Штаты будуць аўтаматычна падтрымліваць гэтую краіну ва ўсіх сфэрах, у тым ліку фінансавай, толькі з удзячнасьці.

Між тым, Аляксандар Квасьнеўскі публічна прызнаў, што ён таксама сумняваўся ў наяўнасьці ў Іраку ЗМЗ, аднак усё ж ня лічыць удзел Польшчы ў вайне ды паваенным аднаўленьні Іраку памылковым. Польскі прэзыдэнт апраўдвае гэта менавіта маральным аспэктам справы. Як хутка ўдасца ўсталяваць мір у Іраку і як хутка ЗША ўдасца вывесьці адтуль свае войскі — гэта пытаньне іншага парадку. Гісторыя, як вядома, ня мае ўмоўнага ладу. Акрамя таго, большасьць іракцаў, калі верыць апошнім апытаньням, лічыць, што іх жыцьцё ў краіне стала лепш, чым за Хусэйнам. Можна зноўку прыгадаць шматлікія тэракты апошняга часу. Але запытайцеся ў жыхароў Расеі чаму яны галасавалі на выбарах за Пуціна, нягледзячы на Дуброўку ці выбух у мэтро? Альбо ў ізраільцянаў — ці зьбіраюцца яны пакідаць сваю краіну? Ці ў жыхароў Нью-Ёрку — чаму яны жывуць у гэтым горадзе пасьля 11 верасьня? Парадокс у тым, што тэрарызм ёсьць платай за дэмакратыю, за свабоднае жыцьцё.

У СССР тэрактаў у клясычным сэнсе не было. Апошні здарыўся 1 сьнежня 1934 г., калі быў забіты Кіраў. А калі тэракты пазьней і здараліся (напрыклад, армянскім нацыяналістам у 70-х удалося зладзіць выбух у вагоне маскоўскага мэтро), дык пра іх нічога не паведамлялася. Таму тэрарысты не маглі дасягнуць сваіх мэтаў у прынцыпе.

Альбо зусім іншы прыклад: у Італіі пры Мусаліні мафія паводзіла сябе ціха, тым больш не было чуваць пра Чырвоныя Брыгады.

Перад самай вайной у Іраку замежнае радыёвяшчаньне на гэтую краіну павялічылася. ЗША закідвалі краіну партыямі адмысловых радыёпрыймачоў, настроеных на пэўную хвалю. Адпаведна павялічылася й колькасьць слухачоў. Празь некалькі тыдняў пасьля адхіленьня ад улады Садама заходняе радыё на кароткіх і сярэдніх хвалях проста перасталі слухаць. І не празь зьмест, а праз тое, што зьявіліся альтэрнатыўныя, больш якасныя крыніцы інфармацыі — незалежныя газэты, спадарожнікавае тэлебачаньне, кіно, Інтэрнэт. У людзей зьявіўся выбар.

Ці не павернецца гэты выбар урэшце супраць Злучаных Штатаў? На гэтае пытаньне змогуць адказаць хіба наступныя пакаленьні іракцаў і амэрыканцаў. Дэмакратыя — гэта свайго роду джын, якога выпусьцілі з бутэлькі: ніхто ня ведае, што з гэтага можа выйсьці. Нам застаецца толькі сачыць за першай маштабнай драмай трэцяга тысячагодзьдзя з дапамогай тэлевізараў.

# Гэта ня наш спорт

**Біятлён мае надзвычайную падтрымку з боку дзяржавы. Нездарма ж ачольваць Фэдэрацыю біятлёну даручаюць такім адказным людзям, як былы кіраўнік КДБ Уладзімер Мацкевіч і цяперашні — Леанід Ерын. Айчынныя біятляністы шырока вядомыя ў сьвеце і нярэдка змагаюцца за самыя высокія пазыцыі на міжнароднай арэне. У той жа час, за апошняе дзесяцігодзьдзе ў краіну з суседніх дзяржаваў было прывезена каля двух дзясяткаў «гатовых» лыжнікаў-стралкоў. Гэтая палітыка Мінспорту атрымала ўхваленьне Лукашэнкі. Чаму ў «беларускім народным спорце» за Беларусь выступаюць адны варагі?**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Пазамінулым уік-эндам у нарвэскім Галмэнколене, што побач з Осла, фінішаваў апошні этап Кубку сьвету. Разам зь ім скончыўся й несупынны паўгадавы маратон лыжнікаў-стралкоў. Скарбонку беларускай каманды папоўніла адно трэцяе месца Ўладзімера Драчова ў гонцы перасьледу на 12,5 км. Заканамерны вынік ня самага ўдалага сэзону.

Выніковая табліца Кубку сьвету — найбольш аб'ектыўны паказьнік дасягненьняў спартоўцаў за год. У яго аснове ляжыць дасканалая сыстэма налічэньня балаў, якія пасьля фінішу кожнай з 26 кубкавых дыстанцыяў 30 найлепшых спартоўцаў атрымліваюць у залежнасьці ад занятага месца.

Узровень канкурэнцыі ў спаборніцтвах за Кубак сьвету надзвычай высокі. Гэтак, у мужчын заліковыя ачкі зарабілі 83 гоншчыкі з 22 краінаў, у жанчын — 79 (24 краіны). Звыкла дамінуюць біятляністы Нарвэгіі, Нямеччыны і Расеі. Астатніх, у тым ліку і беларусаў, дакладней будзе аднесьці да другога эшалону. Дагэтуль найвышэйшым дасягненьнем нашых біятляністаў застаецца другое месца Сьвятланы Парамыгінай паводле вынікаў КС 1993—94 г.

У мужчынскім сьпісе найлепшых біятляністаў плянэты самымі пасьпяховымі зь беларусаў былі самыя сталыя — Уладзімер Драчоў і Алег Рыжанкоў. У жанчын становішча трошкі больш аптымістычнае. Адразу трое — Алена Зубрылава, Кацярына Іванова, Вольга Назарава — трапілі ў лік дваццаці наймацнейшых. Аднак галоўны старт сэзону — Чэмпіянат сьвету ў нямецкім Абэргофе — расчараваў беларускіх аматараў біятлёну.

## Як Папоў выпусьціў пару

Галоўны старт для любога атлета, які бароніць колеры нацыянальнай зборнай, — Алімпійскія гульні і сусьветнае першынство. І толькі пасьля ўжо — кантынэнтальныя чэмпіянаты, Кубкі сьвету й іншыя камэрцыйныя спаборніцтвы ў залежнасьці ад віду спорту і яго распаўсюджанасьці ў тым ці іншым рэгіёне.

Беларускія біятляністы распачалі год са шчытом. За 15 дачэмпіянатаўскіх стартаў КС У.Драчоў тройчы трапляў на п'едэстал і столькі ж у першую дзясятку, Алег Рыжанкоў таксама тры разы быў у ліку дзесяці мацнейшых. У эстафэце нашыя мужчыны мелі перамогу і «срэбра». Лідэрка жаночай каманды Алена Зубрылава заваявала два прызавыя месцы (зь іх адна перамога) і 6 разоў фінішавала ў «дзясятках», а дзявочая эстафэтная чацьвёрка ўпершыню перамагла.

Аднак да галоўнага старту году беларусы падышлі, выпусьціўшы ўсю пару, і здолелі заваяваць усяго адзін мэдаль. Нарэшце «стрэліла» Кацярына Іванова, якая ўсяго другі год выступае за Беларусь. Яна прынесла «бронзу» ў спрынце. Найвышэйшымі дасягненьнямі Рыжанкова і Драчова стала 12-я пазыцыя, у Зубрылавай — 4-я. Абедзьве эстафэты спыніліся таксама на 4-й прыступцы.

Долю адказнасьці за правал мусіў узяць на сябе трэнэрскі лягер. Яго ачольвае вядомы ў мінулым біятляніст Аляксандар Папоў. Некалькі гадоў таму гэтае імя згадвалася ў зьвязку з скандальнай справай аб зьнікненьні 40 тыс. даляраў, прызначаных для аплаты замежнага трэніровачнага збору. Грошай тады так і не адшукалі, а галоўны трэнэр атрымаў усяго толькі вымову.

Не ўпершыню на галоўным старце сэзону беларусы ня могуць паказаць і паловы таго, на што здольныя. Цяжка ўявіць, каб алімпійскі чэмпіён Папоў ня ведаў аксіёмы: перамагаць кожны дзень немагчыма. Каб выйграць галоўны старт, трэба ахвяраваць радавымі, бо сілы і энэргія біятляністаў не бязьмежныя. Тым болей калі ў складзе каманды на лідэрскіх пазыцыях 38-гадовы Драчоў, 36-гадовы Рыжанкоў і 31-гадовая Зубрылава.

## Чэмпіянат для «абкаткі»

Меней чым праз тыдзень пасьля завяршэньня сусьветнага першынства ў Менску распачаўся эўрапейскі чэмпіянат. Удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцьця спаборніцтваў на Кастрычніцкай плошчы сталіцы ўзялі, акрамя спартоўцаў, гледачоў і вышэйшых спартовых чыноўнікаў, два прэзыдэнты: Аляксандар Лукашэнка і Андэрс Бэсэбэрг, які ачольвае Міжнародны зьвяз біятляністаў (IBU).

Цырымонія прайшла не без накладак. Дзяржаўны гімн, з прычыны недастатковага моцнага аркестравага выкананьня, прагучаў пад шум і сьвіст узбуджанага натоўпу. Акрамя сяброў БРСМ і курсантаў сувораўскае вучэльні, якія занялі самыя прэзэнтабельныя пазыцыі ў першых радах, на мерапрыемства прывялі вучняў старшых клясаў некаторых менскіх школаў. Абсурдна й тое, што супольныя трансьляцыі з Раўбічаў Першага нацыянальнага тэлеканалу і Агульнарасейскага тэлеканалу «Спорт» камэнтаваў адзін рэсеец Зьміцер Губерніеў.

З 29 прызёраў сусьветнага чэмпіянату ў Раўбічы прыехалі толькі трое — Кацярына Іванова, украінка Алена Пятрова і паляк Томаш Сікора. Кантынэнтальныя першынствы ня дужа папулярныя ў наймацнейшых лыжнікаў-стралкоў Старога Сьвету дзеля нязручных тэрмінаў іх правядзеньня. Першы такі турнір адбыўся ў 1994 г. і трывала замацаваў за сабой другараднае месца ў перапоўненым календары міжнародных стартаў. Эўрачэмпіянаты — нагода «абкатаць» другія-трэція склады нацыянальных камандаў і таленавітую моладзь. «У Беларусь аддаюцца, па-першае, спаборніцтвы непрэстыжныя; па-другое, тыя, ад якіх адмовіліся іншыя дзяржавы; па-трэцяе, расходныя. І што нам дае іх правядзеньне?.. Лютаўскі чэмпіянат Эўропы ў Раўбічах — тыповы прыклад расходнага мерапрыемства», — гаварыў і памочнік прэзыдэнта Мікалай Ананьеў на «круглым стале» па абмеркаваньні праблемаў супрацоўніцтва Мінспорту, НАКу і нацыянальных фэдэрацыяў.

Да нас не прыехаў ні Оле-Эйнар Бьёрндален, ні зорная пара Рафаэль і Ліў-Грэта Пуарэ, ні Рыка Грос, ні Вольга Пылёва. Сусьветная эліта адпачывала пасьля плянэтарнага форуму і рыхтавалася да заключных этапаў камэрцыйнага Кубку сьвету. А Алег Рыжанкоў і К° мусілі выкладацца ў Раўбічах, бо дзяржаўныя ідэолягі абвесьцілі біятлён «народным».

## Ды які ён народны?

У спаборніцтве з маладымі рэзэрвістамі стомленыя беларусы перамаглі, але без асаблівага фаервэрку: сем мэдалёў, пяць зь якіх — на рахунку прыгожай паловы каманды. Навасьпечаны чэмпіён Эўропы Аляксандар Сыман пасьля перарможнай гонкі ў жывым этэры БТ прамовіў тое, аб чым думалі многія, але ніхто не адважваўся сказаць: «Мы стаміліся ад пастаяннага патрабаваньня мэдалёў!»

Нават міністар спорту, бранятанкавы Юры Сівакоў адзначыў: «Калі я ў нядзелю на закрыцьці чэмпіянату Эўропы глядзеў на нашых біятлянiстак — Іванову, Зубрылаву, Ананьку і Назараву, якія стаялі за маёй сьпінай на гэтым пастамэнце для ўручэньня кіраўніцтву аргкамітэту кветак, а назаўтра а 9-й гадзіне мусілі адлятаць на чарговы этап Кубку сьвету ў Амэрыку, — іх зьнясілены выгляд мяне, вядома, вельмі

ўразіў. Мы павінны быць нацыянальна арыентаванымі прагматыкамі, а ня цынікамі: узяць сваё, а там хай хоць сонца ня ўзыдзе». Напрошваецца пытаньне: а дзе ж вы раней былі?

Падчас раўбіцкага чэмпіянату Эўропы дзяржаўныя СМІ спрэс ужывалі слова «біятлён» побач з азначэньнем «народны спорт». Бо гэткае прагучала й з вуснаў найвышэйшых дзяржаўных пэрсонаў. Ці сапраўды спэцыфічна-патрабавальны біятлён стаўся ў Беларусі такім жа народным, як футбол, лёгкая атлетыка і хакей?

Трохразовы алімпійскі чэмпіён Уладзімер Парфяновіч лічыць гэтае сьцьверджаньне прыцягнутым за вушы: «Ніякі біятлён не народны спорт. Хто сказаў, што біятлён папулярны спорт? Колькі беларускіх дзяцей займаецца біятлёнам? Пяцьдзясят, сто? А менавіта гэта і ёсьць галоўным паказьнікам папулярнасьці. А колькі да нас прывезьлі расейцаў? Тут пытаньне ў тым, што, калі б прэзыдэнт Лукашэнка езьдзіў не на лыжах і роліках, а на кані, у нас самым папулярным спортам стаўся б конны. Паглядзіце на Расею. З прыходам Пуціна ва ўладу шырокую папулярнасьць набыло дзюдо. І гэткая тэндэнцыя назіраецца ва ўсіх дзяржавах з харызматычнымі кіраўнікамі».

## Прывазны спорт

У Беларусі спорт лыжнікаўстралкоў пачаў культывавацца з 1959 г., на два гады пазьней, чым у Расеі. А першая перамога айчынных біятляністаў зьвязаная зь імем Вячаслава Таўкачова. У 1969 г. на юніёрскім чэмпіянаце сьвету на курорце Закапанэ ён двойчы ўзьнімаўся на п'едэстал: атрымаў бронзавы мэдаль у індывідуальнай гонцы на 15 км, а пасьля залаты — у складзе зборнай СССР за перамогу ў эстафэце. Праз 13 гадоў у Раўбічах наймацнейшым сярод юніёраў плянэты стаўся другі беларус — Мікалай Праволоцкі.

Званьне першага БССРаўскага чэмпіёна плянэты сярод дарослых належыць Юр'ю Калмакову. Ураджэнец невялічкага сяла Малмых, што на Далёкім Усходзе Расеі, ён стаўся пераможцам саюзнага (1968) і сусьветнага (1973) чэмпіянатаў у эстафэце, выступаючы за Новасібірскую вобласьць. Напярэдадні плянэтарнага форуму-1974 расейца прывезьлі ў Беларусь.

Масавы завоз у Беларусь спартоўцаў з РСФСР пачаўся адразу пасьля вайны. Так у Менску зьвіліся лёгкаатлеты Анатоль Юлін, Цімафей Лунёў, Марыя Іткіна, шахматысты Ісак Баляслаўскі, Аляксей Суэцін, Кіра Зварыкіна… Адным з ідэолягаў «вараскае тэорыі» быў трэнэр Герман Бокун. Менавіта ён прывёз у Менск цэлую шабельную каманду на чале зь вядомым трэнэрам Аляксандрам Фелем, а таксама дзясяткі іншых атлетаў і настаўнікаў.

Канец 80-х— пачатак 90-х адзначыўся ўсплёскам біятлённага імпарту ў Беларусь. Спачатку ў Менск з Новасібірску пераехаў чэмпіён сьвету Сяргей Булыгін. Усьлед за ім — ня менш тытуляваныя Юры Кашкараў і Аляксандар Папоў (абодва — са Сьвярдлоўску).

«Добра, што ёсьць ператок спартоўцаў… Галоўнае, каб ён насіў цывілізаваны характар, каб мы дамаўляліся», — казаў Лукашэнка кіраўнікам спартовых ведамстваў Расеі, Украіны, Казахстану і Кыргызстану. Ён нават выказаў гатоўнасьць прапанаваць беларускія базы для сумеснай падрыхтоўкі атлетаў краінаў СНД да Алімпіяды ў Атэнах. Таксама выказаў падзяку кіраўнікам спартовых камітэтаў Расеі й Украіны за «цярплівыя адносіны да пераходу спартоўцаў у Беларусь».

## Скрозь варагі

У большасьці відаў спорту існуюць даволі жорсткія правілы, якія рэгулююць і абмяжоўваюць масавую міграцыю атлетаў. Да прыкладу, у лёгкай атлетыцы, перш чым атрымаць права выступаць за новую нацыянальную каманду, трэба прайсьці пэрыяд трохгадовай «ізаляцыі» — устрыманьня ад удзелу ў афіцыйных міжнародных турнірах. Гэтак, віцебскі скакун з шастом Зьміцер Маркаў, які меў намер выступаць за Аўстралію, у 1997 г. наўмысна прапусьціў Чэмпіянат сьвету, хоць і быў заяўлены ў склад беларускай зборнай. Затое на Алімпіядзе ў Сыднэі ён выступаў ужо пад аўстралійскім сьцягам.

Міжнародная фэдэрацыя футболу (FIFA) дазваляе мяняць спартовае грамадзянства толькі ў тым выпадку, калі гулец не правёў аніводнага матчу ў складзе сваёй зборнай. У біятлёне куды больш мяккія правілы. Пераходы з адной нацыянальнай каманды ў іншую не забараняюцца, калі існуе ўзаемная дамоўленасьць між фэдэрацыямі.

Гэтак, выхаванец хантымансійскай школы Віктар Майгураў пасьля некалькіх гадоў выступленьня за Беларусь вярнуўся ва ўлоньне расейскай каманды. Па тым жа шляху пайшоў алімпійскі чэмпіён-92 Яўген Рэдзькін. За апошнія дзесяцігодзьдзе з Расеі ў Беларусь прыехалі Натальля Пермякова, Ірына Какуева, Ксенія Зікункова, Алена Хрусталёва, Яўгенія Куцапалава, Лілія Яфрэмава, Вольга Назарава, Ігар Хахракоў, Аляксей Айдараў, Вадзім Сашурын, Рустам Валіулін, Уладзімер Драчоў, Яўген Сьціпанаў… Пакрыўджаная Укрмінспортам Алена Зубрылава адчыніла брамку з паўднёвага боку. Разам зь ёй прыехала яе родная сястра Натальля Агурцова.

«Гэтая палітыка глушыць беларускі спорт, — гаворыць Рэнуальд Кныш, заслужаны трэнэр СССР, настаўнік алімпійскіх чэмпіёнак Алены Ваўчэцкай і Вольгі Корбут. — Усё меней нашых хлопцаў і дзяўчатаў у яго ідуць. Легіянэры ў складах нашых зборных — гэта ўжо не беларускі спорт. Гэта ня нашыя перамогі. Да таго ж, на іх выдаткоўваюцца велізарныя сродкі, а нам тым часам не застаецца амаль нічога». «Калі б мы запрашалі трэнэраў, якія б вучылі нашых спартоўцаў, гэта было б нармальнай зьявай, — дадае У.Парфяновіч. — А так варагі атрымліваюць аграмадныя грошы, кватэры і г.д. У той жа час, паглядзіце на нашыя ўбогія спартзалі. Нашым дзецям няма дзе займацца. У звычайных школах не хапае мячоў, дзіцяча-юнацкія спартовыя школы маюць мізэрнае фінансаваньне. А гэта ж нашае заўтра».

## Арлоўская, Рыжанкоў ды Сыман

Але ня трэба думаць, што суседзі дзеляцца з намі спартовым «матэрыялам» задарма. Аднойчы не расплаціліся за Куцапалаву і Хрусталёву, дык расейцы скандал на Алімпіядзе ў Солт-Лэйк-Сыты ўзьнялі. Прыйшлося скарыстаць аўтарытэт віцэ-прэзыдэнта НАКу Аляксандра Мядзьведзя і ягоныя добрыя стасункі з губэрнатарам Краснаярскага краю Аляксандрам Лебедзем, але адну гонку дзяўчатам прыйшлося прапусьціць.

Мінулы сэзон у асноўным складзе жаночай зборнай распачынала толькі адна выхаванка беларускіх настаўнікаў — Людміла Арлоўская. Сёлета на яе месцы Людміла Ананька. У мужчынскай камандзе айчынную школу біятлёну прадстаўляюць Алег Рыжанкоў і Аляксандар Сыман.

За гады незалежнасьці толькі два беларускія спартоўцы дасягнулі сусьветнае клясы — Сьвятлана Парамыгіна з Наваполацку ды Алег Рыжанкоў з Магілёва. А колькі тых, хто яе не дасягнуў, — браты Песьцеравы, Сакалоўскі, Іваноўскі, Маршчакін, Шыхаў, Усыцінаў, Мароз, Грыгор'ева, Ваўкавец, Арлоўская... Можа быць, таму і не дасягнулі, што «імпартныя» перакрывалі і працягваюць перакрываць лыжню сваім. У нас ёсьць таленавітыя хлопцы і дзяўчаты: Сяргей Новікаў, Сяргей Дашкевіч, Юры Шалковіч, Людміла Ананька, Тацяна Шынтар, Людміла Калінчык... Каб яны асвоіліся ў дарослым спорце, неабходны пэўны час, а настаўнікам — трываньне. Аднак цалкам можа стацца і так, што за сьпінамі расейска-ўкраінскага легіёну гэтыя таленты змарнеюць, як у свой час адбылося зь вялікай групай іх папярэднікаў. Два заваяваныя мэдалі і толькі чацьвертае агульнакамандные месца беларускіх юніёраў на чэмпіянаце Эўропы — трывожны сыгнал.

**Кастусь Лашкевіч**




**Алена Зубрылава прывезла за сабой у Беларусь і родную сястру Натальлю Агурцову. Ад часу заснаваньня беларускае біятлённае школы Беларусь жыве на завазных спартоўцах.**

PHOTO.BYMEDIA.NET



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Аляксандар Сыман: «Мы стаміліся ад пастаяннага патрабаваньня мэдалёў!»**



Уладзімер Парфяновіч: «Варагі атрымліваюць аграмадныя грошы, кватэры. У той жа час, паглядзіце на нашыя ўбогія спартзалі. У звычайных школах не хапае мячоў, дзіцяча-юнацкія спартовыя школы маюць мізэрнае фінансаваньне. А гэта ж нашае заўтра».

# Фініш сэзону

Кубак сьвету, выніковы залік

**Жанчыны**

| | |
|---|---|
| 1. Ліў-Грэта Пуарэ (Францыя) | 955 ачкоў |
| 2. Вольга Пылёва (Расея) | 860 |
| 3. Сандрын Бэйлі (Францыя) | 768 |
| 4. Ушы Дызл (Нямеччына) | 733 |
| 5. Ганна Богалі (Расея) | 687 |
| 6. Марціна Глагоў (Нямеччына) | 659 |
| 7. Катрын Апэль (Нямеччына) | 652 |
| 8. Каця Вільгельм (Нямеччына) | 561 |
| **9. Алена Зубрылава (Беларусь)** | **543** |
| **...17. Кацярына Іванова (Беларусь)** | **358** |
| **...19. Вольга Назарава (Беларусь)** | **311** |
| **...48. Ксенія Зікункова (Беларусь)** | **40** |
| **...54 Людміла Ананька (Беларусь)** | **22** |

**Мужчыны**

| | |
|---|---|
| 1. Рафаэль Пуарэ (Францыя) | 1010 ачкоў |
| 2. Оле-Эйнар Бьёрндален (Нарвэгія) | 901 |
| 3. Рыка Грос (Нямеччына) | 769 |
| 4. Халвард Ханэвалд (Нарвэгія) | 688 |
| 5. Ларс Бэргер (Нарвэгія) | 589 |
| 6. Сяргей Ражкоў (Расея) | 578 |
| 7. Томаш Сікора (Польшча) | 516 |
| 8. Фродэ Андрэсэн (Нарвэгія) | 514 |
| **...10. Уладзімер Драчоў (Беларусь)** | **503** |
| **...22. Алег Рыжанкоў (Беларусь)** | **280** |
| **...34. Рустам Валіулін (Беларусь)** | **145** |
| **...35. Аляксей Айдараў (Беларусь)** | **144** |
| **...59. Аляксандар Сыман (Беларусь)** | **24** |
| **...75. Сяргей Новікаў (Беларусь)** | **7** |

# Б'ёрндален: «Зьмена грамадзянства не для мяне»



Легендарнаму нарвэскаму біятляністу, шматразоваму чэмпіёну сьвету і алімпійскіх гульняў Оле-Эйнару Б'ёрндалену было прапанавана стаць грамадзянінам Італіі або Аўстрыі. «Ёсьць людзі, якія пытаюць мяне, ці не жадаю я зьмяніць грамадзянства. Не было б меншай праблемы, чым зьмена грамадзянства, але гэтая тэма не для мяне», — казаў Б'ёрндален у інтэрвію газэце «Афтэнпостэн». Нарвэскі кумір цяпер жыве ў Аўстрыі, у мястэчку Абэрцілах на высакагор'і 1400 мэтраў. Побач Італія, дзе жыве яго каханая Наталі Сантэр. Зімовыя Алімпійскія гульні праз два гады пройдуць у Турыне на вышыні 1600 мэтраў. Таму Б'ёрндален жадае жыць і трэніравацца менавіта на такой вышыні, але пра зьмену пашпарта нават і не думае. Бо ў Эўропе гандаль грамадзянствам не ўяўляецца магчымым.

# Раўбічы




Алімпійскі спартовы комплекс «Раўбічы» вядзе сваю гісторыю з 1974 г. і доўгі час быў цэнтрам падрыхтоўкі біятляністаў СССР. Яго галоўная вартасьць — кампактнасьць разьмяшчэньня стрэльбішчаў, гатэляў і адміністрацыйных пабудоваў. За тры дзесяцігодзьдзі «Раўбічы» прынялі тры плянэтарныя форумы і два эўрапейскія.

Да сёлетняга першынства спарткомплекс быў мадэрнізаваны. Згодна з сусьветнымі стандартамі, пашырылі лыжнаролерную трасу, давялі да ладу гатэльную гаспадарку, зрабілі касмэтычны рамонт бытавых аб'ектаў. На тэрыторыі комплексу стварылі восем аўтастаянак, а перад глядацкімі трыбунамі ўсталявалі сучаснае электроннае таблё. Каб ня трапіць у залежнасьць ад прыроды, апошні тыдзень сьнегавыя гарматы выпрацоўвалі белую масу практычна бесьперапынна.

Але для таго каб зладзіць найбуйнейшыя спаборніцтвы, кшталту Кубку ці чэмпіянату плянэты, якія ўздымаюць прэстыж дзяржавы і даюць магчымасьць вярнуць выдаткаваныя грошы, гэтага пакуль недастаткова. Раўбіцкі комплекс састарэў маральна. Найноўшыя біятлённыя арэны ў сьвеце значна розьняцца ад «Раўбічаў» савецкага ўзору. Узяць хаця б глядацкія трыбуны, на якія заўзятару трапіць вельмі няпроста. Ці стрэльбішча, якое месьціцца надта далёка ад судзейскага корпусу.

# На «Альфа-радыё» паболела мовы

Цягам апошніх чатырох месяцаў на «Альфа-радыё» двойчы на дзень выходзілі беларускамоўныя выпускі навінаў. Гэта спадабалася бальшыні слухачоў станцыі, і зь бягучага панядзелка ўжо тройчы на дзень (зранку, удзень і ўвечары) навіны перадаюць па-беларуску. Гэтае новаўвядзеньне прымеркаванае да 5-годзьдзя станцыі.

Пры канцы сьнежня мінулага году кантрольны пакет акцыяў «Альфа-радыё» (51%) перайшоў да Мінінфармацыі. Быў звольнены генэральны дырэктар станцыі Віталь Цьвердахлебаў. Разам зь ім сышоў і генэральны прадусар Сяргей Кузін. Цяпер ён узначальвае адну з радыёстанцыяў у Кіеве. Аднак дырэктар станцыі Пётра Стралкоўскі адзначае, што Міністэрства «ня ўмешваецца ў творчы працэс»: «Мы робім тое, што вырашаем самі. Беларуская мова ў этэры — наш сьвядомы крок. Бо 70% людзей лічаць сваёй роднай моваю беларускую. Ці нармальна тое, што яе няма ў этэры FM-станцыяў?» Тое ж кажа і кіраўнік службы навінаў «Альфы» Іван Мірскі (Бялоўскі), з ініцыятывы якога беларушчына зьявілася на радыё.

**Зьміцер Данскі**

На сёньня ў сталіцы вяшчаюць 14 FM-радыёстанцыяў:
**Радыё «Менск»** (92,4) — дзяржаўная, гаспадар — Менгарвыканкам;
**«Мэлёдыі стагодзьдзя»** (96,2) — уваходзіць у холдынг «Бі-Эй»;
**«Расейскае радыё»** (98,9) — рэтрансьляцыя сеткавай расейскай радыёстанцыі;
**«Юністар»** (99,5) — 51% акцыяў — БДУ, 49% — нямецкая кампанія «Arbo Media Net»;
**«Гіт-FM»** (100,4) — рэтрансьляцыя сеткавай расейскай радыёстанцыі;
**«Пілёт FM»** (101,2) — структурнае падразьдзяленьне БРСМ;
**Радыё «Рокс»** (102,1) — большасьць капіталу — недзяржаўны;
**Канал «Культура»** (102,9) — дзяржаўная, структурнае падразьдзяленьне НДТРК;
**«Радыюс-FM»** (103,7) — дзяржаўная, структурнае падразьдзяленьне НДТРК;
**Радыё «Бі-Эй»** (104,6) — прыватная (гаспадар — гендырэктар Яўген Шарашэўскі);
**«Аўтарадыё»** (105,1) — недзяржаўная, якой валодаюць тры саўладальнікі, асноўны зь іх, паводле нашай інфармацыі, — прадпрыемства «Белхард-электронікс»;
**Першы нацыянальны канал** (106,2) — структурнае падразьдзяленьне НДТРК;
**Радыё «Мір»** (107,1) — структурны аддзел аднайменнай міждзяржаўнай кампаніі;
**«Альфа-радыё»** (107,9) — 51% — Мінінфармацыі, 49% — ВКП «Без праблем».

Цягам бліжэйшых месяцаў павінны адкрыцца яшчэ дзьве FM-станцыі: «Новая хваля», якая будзе належаць Менскаму аблвыканкаму, а заснавальнікам другой стане ФПБ.

# Дабраліся да Караткевіча




У ноч з 18 на 19 сакавіка была скрадзеная памятная пліта з помніка Ўладзімеру Караткевічу ў Воршы. Помнік слыннаму аршанцу быў устаноўлены ў Прыдняпроўскім парку ў 1992 г., ледзь не на тым месцы, дзе да вайны стаяла хата Караткевічаў. Дарэчы, помнік (аўтары Ігар Голубеў і Мікалай Сморчак) адразу завершаны ня быў. Спачатку адліты ў бронзе малады рамантычны паэт стаяў на сьціплым бэтонным пастамэнце. У 1997 г. яго ўстанавілі на гранітную глыбу. Для гэтага, праўда, давялося помнік дэмантаваць і везьці ў Віцебск. Раптоўнае «зьнікненьне» помніка выклікала тады сярод месьцічаў нежартоўны пярэпалах. Адначасова аздобілі і пляцоўку каля помніка. Да мармуровых пліт была прымацаваная стылізаваная пад аркуш пліта з аўтографам У.Караткевіча і радкамі зь ягонага верша «Ворша», адлітая на адным зь мясцовых заводаў зь некаляровага мэталічнага сплаву.

За больш чым 10 гадоў існаваньня помніка гэта бадай што першы акт вандалізму, бо Прыдняпроўскі парк — месца даволі ажыўленае й люднае: побач адна з цэнтральных вуліцаў імя Карла Маркса (былая Зялёная), за два крокі — кавярня «Тры лімоны»; дый памяць пра выдатнага земляка ў Воршы шануюць.

З усяго відаць, зламысьнікі паквапліся на мэталёвую пліту, якая была ня надта добра прымацаваная. І калі раней назіралася сапраўдная эпідэмія крадзяжоў каляровых мэталаў, дык цяпер устойлівым попытам карыстаецца звычайнае жалеза. Прыватныя скупшчыкі даюць за тону мэталалому, які пасьля вывозяць у Смаленскую вобласьць, 20 даляраў. Там тона ўжо каштуе 50 даляраў. Гавораць, каб безь перашкод прайсьці кантроль на мяжы, спатрэбіцца ўсяго 20 у.а. Так што сёньня мэталалом зьбіраюць ня толькі піянеры. Хто скраў пліту з помніка Караткевічу, разьбіраецца міліцыя. На жаль, за апошнія гады ніводнага з тых вандалаў, якія спакушаліся на помнікі й мэмарыяльныя дошкі (у тым ліку з магілак), не знайшлі і не пакаралі. Застаецца дадаць, што помнік Караткевічу, у адрозьненьне ад помнікаў Леніну, пакуль ня ўнесены ў Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

# Антыпіўная пастанова

Берасьцейскі гарвыканкам прыняў «цікавую» пастанову. Пра забарону гандлю моцнымі напоямі пасьля 22.00. У гэты сьпіс чамусьці трапіла і піва. І пасьля 22-й з усіх крамаў (акрамя прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня) яно зьнікае. Але застаюцца напоі кшталту «Кактэйль Молатава» і «Водка-лімон».

А яшчэ напярэдадні сьвята кожную краму прымушаюць набываць дзьве налепкі «985 гадоў Берасьцю'2004» з гербам гораду. Цана кожнай 600 руб. Таксама кожны прадпрымальнік мусіць «добраахвотна-прымусова» пералічыць на добраўпарадкаваньне гораду 35 тыс.

Дасылаю Вам іншы цікавы дакумэнт. Усё, што ў ім надрукавана, вельмі карысна, хоць трохі, на жаль, і нясвоечасова, акрамя выдзеленага мной.


РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
МІНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ СПАЖЫВЕЦКАГА РЫНКУ

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ
МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ ПОТРЕБИТЕЛЬСКОГО РЫНКА

...004, г.Минск, ул.Коллекторная,11. Тел. 220-12-57. Р/с № 3012000008452 ф/в 510 АСБ Беларусбанк код 603

[redacted]

Руководителю торгового предприятия

Во исполнение поручения от 10.01.04г. №10/04 главного идеологического управления Администрации Президента Республики Беларусь по пропаганде государственной символики, являющейся воплощением национальной идеи белорусского общества, примите необходимые меры по обеспечению обязательного наличия в рабочих кабинетах руководителей и их заместителей, в местах проведения собраний, совещаний атрибутов государственной символики (герб, флаг) и портрета Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко, а также организации торговли товарами с государственной и национальной символикой, приоритетному показу и выкладки белорусских товаров в центральных местах и основных покупательских потоках, правильному оформлению ценников с обязательным указанием белорусских производителей.

В целях активной кампании по созданию положительного имиджа отечественного производителя проработайте вопрос с промпредприятиями об оформлении оконных витрин, торговых залов их логотипами, предоставлению специального оборудования для показа их продукции. Активизируйте проведение выставок-продаж, расширенных продаж, демонстраций моделей и примите дополнительные меры по повышению эффективности взаимодействия по вопросам стимулирования продажи отечественных товаров с использованием современных средств маркетингового обслуживания.

В вышеназванном поручении указывается на недостаточно активную раскрутку рекламы белорусских товаров. Зачастую более качественные белорусские товары не находят спроса из-за засилья рекламы иностранного производителя и низкого качества оформления упаковки товаров белорусских производителей, отсутствию в продаже спортивной одежды с белорусской и национальной символикой для детей и взрослых. В целом совместно с промышленными предприятиями необходимо развернуть широкую пропаганду белорусских товаров под общим лозунгом «Купляйце беларускае».

О проделанной работе и принятых мерах просим информировать ГУПР в срок до [redacted]

Зам. начальника Главного управления В.Н.Мирголовский

2205075

**Берасьцейскі спажывец**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

17 сакавіка судовы выканаўца апісаў маёмасьць карэспандэнткі «Белорусской деловой газеты» ў Гомельскай вобласьці **Ірыны Макавецкай.** Яшчэ 1 кастрычніка 2003 г. суд Кастрычніцкага раёну Менску пастанавіў спагнаць з журналісткі на карысьць сьледчага Пракуратуры Вячаслава Цераховіча 300 тыс.руб. за абразу гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі ў артыкулах пра крымінальную справу рэктара Гомельскага мэдінстытуту Юр'я Бандажэўскага. Кіраўніцтва Белаазерскага гарвыканкаму забараніла праводзіць 19 сакавіка сэмінар, прысьвечаны праблемам жыльлёва-камунальнай гаспадаркі, які арганізоўвалі дэпутаты дэмакратычнай групы **«Ініцыятыва».** Журналіста **Валер'я Дранчука**, кіраўніка грамадзкай ініцыятывы «Тегга-Конвенция», 19 сакавіка не пусьцілі на тэрыторыю нацыянальнага парку «Белавеская пушча». Дранчук меўся сустрэцца там з экспэртамі ЮНЭСКА і Міжнароднага саюзу аховы прыроды. 22 сакавіка пэдрада баранавіцкага каледжу лёгкай прамысловасьці ўмоўна выключыла актывістку «Зубра» студэнтку **Кацярыну Банкевіч** з навучальнай установы: колькі дзён таму яна была затрыманая за раздачу інфармацыйнага бюлетэню «Зубр-Баранавічы». Цяпер дзяўчыну могуць выгнаць з каледжу пры найменшым парушэньні. 23 сакавіка **Вінцука Вячорку, Алену Скрыган і Анатоля Паўлава** — дэлегацыю Народнай кааліцыі «Пяцёрка+» — затрымалі ў Слоніме за ўдзел у «несанкцыянаваным сходзе». Дэлегацыю запрасіў на сваю гадавую справаздачу перад выбаршчыкамі дэпутат Слонімскага гарсавету Іван Шэга, вядомы ў горадзе доктар і сябар Партыі БНФ. Ён плянаваў зрабіць дэпутацкую сустрэчу ў СШ №4. Аднак а 18-й гадзіне, калі ля зачыненых школьных дзьвярэй сабралася сорак выбаршчыкаў, зьявілася дырэктарка, якая спалохана сказала, што на загад «зьверху» пусьціць дэпутата ў школу ня можа. І.Шэга вырашыў правесьці спатканьне з выбаршчыкамі на школьным дворы-стадыёне, балазе там ёсьць доўгая лаўка.

**АШ**

## Ільготы для Шэймана і Тозіка

Магілёўскі гарвыканкам вызначыў сьпіс ільготнікаў, якія могуць прэтэндаваць на аднаразовую беззваротную субсыдыю і фінансавую дапамогу падчас набыцьця ці будаўніцтва жыльля. У лік ільготнікаў, сярод якіх маладыя сем'і, вайскоўцы, аўганцы, інваліды й вэтэраны, дзецісіроты, хворыя на сухоты, трапілі й судзьдзі, пракурорскія работнікі й супрацоўнікі Камітэту дзяржкантролю.

**Алеся Чыж, Магілёў**

## Вынаходка палачаніна

Былы шафёр наваполацкага аўтапарку №6 Мікалай Міхайлаў вынайшаў незвычайны рухавік унутранага згараньня (РУЗ). Сам вынаходнік называе яго рухавіком XXI ст. і пэўны, што ягоны РУЗ лепшы за той, над якім працуюць спэцыялісты Лівэрморскай лябараторыі ЗША.

Рухавік Міхайлава працуе на прынцыпе двухбаковага дзеяньня поршня пры выкарыстаньні сумесі бэнзыну, паветра, вады і адпрацаваных газаў. Вынаходнік аб'яднаў асобныя тэхнічныя прынцыпы дызэльнага ды карбюратарнага рухавікоў і паравой машыны. Паводле разьлікаў аўтара, яго рухавік будзе мець у два разы вышэйшы каэфіцыент карыснага дзеяньня, чым звычайны РУЗ. Акрамя таго, рухавік Міхайлава можа сілкавацца бэнзынам зь нізкім актанавым лікам.

Аднак спэцыялісты па рухавіках і дзяржаўныя чыноўнікі халодна сустрэлі вынаходства палачаніна. У 1998 г. Міхайлаў атрымаў патэнт на сваю вынаходку, але дагэтуль не дамогся, каб хто-небудь прафінансаваў стварэньне досьледнага ўзору. Бо толькі гэткім чынам можна давесьці слушнасьць тэхнічнай ідэі.

Цікава, што ў сваіх адмоўных рэцэнзіях на рухавік Міхайлава беларускія спэцыялісты па РУЗ ніколі не спасылаліся на нейкія ўласныя найноўшыя распрацоўкі. Відавочна, у Беларусі, у эканоміцы якой аўтамабіле- і трактарабудаваньне займаюць істотнае месца, не вядзецца праца па стварэньні айчыннага рухавіка XXI ст.

**Васіль Кроква, Полацак**

## $711 на кожным кантэйнэры

Днямі на тэрыторыі Асіповіцкага вагоннага дэпо адбылася прыёмка першых двух айчынных кантэйнэраў, прызначаных для чыгуначных, аўтамабільных і марскіх перавозак. Асіповіцкія вагонарамонтнікі зрабілі тэхналягічны і арганізацыйны прарыў, які гарантуе ім на даволі доўгі час усе выгоды манапольнай вытворчасьці вострa запатрабаванай прадукцыі. Беларуская чыгунка, кантэйнэрны парк якой патрабуе тэрміновай замены, зэканоміць на набыцьці кожнага асіповіцкага кантэйнэра каля 711 даляраў. У пэрспэктыве — атрыманьне замоваў з краін Балтыі і СНД. Масавы выпуск новых кантэйнэраў (да канца году іх плянуецца выпусьціць 350) пачнецца праз месяц.

**«Асіповіцкі край»**

## Не пакідаць дзяцей з «Зубром»

У Баранавічах да гэтага часу не забыліся на «зуброў». Вельмі ж яны напалохалі ўсё мясцовае чынавенства. Таму сёлета й вясновыя канікулы ў школках праходзяць па-іншаму. Дадзена распараджэньне не пакідаць дзяцей сам-насам з вуліцаю. Настаўнікі ладзяць розныя гурткі, дзеці бавяць у іх час, з бацькоў дзяруць дадатковыя грошы за харчаваньне, гарадзкі бюджэт таксама пазапляцава выдаткоўвае сродкі на дзіцячую ежу. Але калі разабрацца, дык робіцца гэта ўладамі не дзеля таго, каб крыху супыніць бадзяньне школьнікаў без дагляду. Папросту баяцца «зуброўскага» ўплыву.

## За плячыма Ільліча

У цэнтры Баранавіч, за некалькі крокаў ад помніка Леніну, было знойдзена выбуховае прыстасаваньне. Яно знаходзілася ў поліэтыленавым пакеце і ўяўляла сабою 5-літровую каністру з прычэпленымі да яе ліпучкай кварцавым гадзіньнікам і батарэйкамі. Як выявілі пасьля сапёры, у каністры была шашка з дэтанатарам. Аднак прыстасаваньне не спрацавала: будзільнік быў выстаўлены на 8:20, а знайшлі каністру на дзьве гадзіны пазьней. Сапёры вывезьлі й зьнішчылі самаробную бомбу. Цікава, што знаходзілася яна ля фатацэнтру «Кадар», які летась ужо падпальвалі. Тады згарэла ўся студыя. Цяперака органы высьвятляюць, ціт гэта за разборкі канкурэнтаў такія. Дарэчы, гаспадар фатацэнтру атрымаў тады за пажар добрую страхоўку.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Саюз палякаў набірае вагу

Старшынька раённага аддзяленьня Саюзу палякаў Беларусі ў Астраўцы Марына Таратук днямі вярнулася зь Беластоку з дыплёмам магістра пэдагогікі і псыхалёгіі. У нас яна ўжо другая, хто валодае падобным дыплёмам Беластоцкага ўнівэрсытэту.

**Мар'ян Вянгроўскі, Астравец**

## Лебедзяў выкрасьляць з Чырвонае кнігі



У Беларусі распладзіліся лебедзі. Лебедзяў-шыпуноў, якія гняздуюцца ў нас, стала столькі, што іх сёлета прыбяруць з Чырвонай кнігі. Дзякуй Богу! І нашыя ўнукі спакойна будуць назіраць за гэтай высакароднай і гожай птушкаю. Што праўда, заслугаў тут нашых няма. Вось ужо дзьве сотні гадоў, як лебедзяў перасталі есьці дзякуючы большай колькасьці сваёйскае птушкі. Прапала й мода на іхны каштоўны пух ды пёры. Сталялі іх апошнім стагодзьдзем ня ў нас, а ў арабскіх краінах, дзе яны часам зімуюць. Некалькі цёплых зімаў запар ня лёталі яны ў выраі. Не шукалі спажывы на чужыне. Толькі гэтак і выжылі. І разгадаваліся.

**СХ**

# У Варшаве валадарыць «NRM»

Дзень, калі ў Варшаве мусіў адбыцца канцэрт «NRM», распачаўся для мяне зь невялікага шоку: у «Gazecie Wyborczej» пабачыў ажно цэлую старонку, прысьвечаную гэтаму гурту і ўвогуле сытуацыі на беларускай рок-сцэне. І гэта пры тым, што матэрыялы пра «NRM» напярэдадні зьявіліся яшчэ ў «Rzeczypospolitej», «Newsweek Polska». Таму сьціплыя словы Лявона Вольскага пра тое, што «ў Польшчы мы гурт невядомы», у панядзелак 22 сакавіка напэўна ўжо не адпавядалі сапраўднасьці...

Далей — яшчэ сюрпрызы. Па дарозе на канцэрт, у гарадзкім аўтобусе, сустрэў Зьмітра Вайцюшкевіча. За пяць хвілінаў пачуў, што ў бліжэйшы час у яго заплянаваныя прынамсі некалькі праектаў: беларуска-японскі, беларуска-італьянскі (кавалак «Бывайце здаровы» па-італьянску ён нават потым засьпяваў). «NRM» упершыню пачала сваё турнэ канцэртамі ў Беластоку і Варшаве («Нарэшце мы праедземся па ўсёй тэрыторыі ВКЛ, бо будзе яшчэ Смаленшчына і Вільня», — сказаў Піт), а Вайцюшкевіч запісвае нэапалітанскія песьні — прынамсі за гэтых выканаўцаў можна парадавацца...

Канцэрт у варшаўскім клюбе «Proxima» — гэта рэч сур'ёзная і прэстыжная. Тут выступаюць зоркі рок-музыкі: супэрпапулярны польскі «Kult» ці ня менш папулярныя заходнія «Machine Head», «U.D.O.». Канцэрт «NRM» адбыўся ў межах імпрэзы «Беларуская музычная партызанка». Беларусы і палякі — аматары беларушчыны месяц таму пасьпяхова наладзілі ў Варшаве дыскатэку з цалкам беларускай музыкай. Цяпер вось пайшлі далей.

Арганізатары прыкметна хваляваліся. Ці прыйдзе дастаткова людзей на беларускі гурт, каб і канцэрт глядзеўся добра, і, што хаваць, каб хапіла аплаціць шалёныя цэны арэнды залі?!

У 20.15, калі на сцэну, упрыгожаную вялізным бел-чырвона-белым сьцягам, падняўся адзін зь беларусаў ды абвесьціў, што падзея прысьвечаная Дню Волі, усё ўжо было зразумела — імпрэза ўдасца.

Каб на канцэрт у варшаўскім клюбе прыйшло каля 250 слухачоў, здараецца нячаста. А каб так віталі і тройчы прасілі на біс? Таксама яшчэ ня бачыў.

Канцэрт «NRM»? Яго, зразумела, трэба чуць і бачыць. Гіты («Паветраны шар», «Тры чарапахі», «Партызанская») сьпявалі хорам, найноўшыя песьні («Рок-н-рол не ўратуе», «Лёгкія-лёгкія») таксама ішлі «на ўра».

Прысутныя, сярод якіх было шмат палякаў у майках зь беларускай сымболікай, здавалася, самі не чакалі настолькі, як кажуць у Польшчы, «чадовага» выступу, у такім якасным выкананьні — гук, сьвятло.

Бармэн з «Proxima», які напэўна бачыў тут шмат чаго, на пытаньне, як яму беларускі рок, пакруціў галавой ды сказаў: «Па-польску, па-ангельску ці пабеларуску — якое гэта мае значэньне? Галоўнае, што граюць супэр!»

Калі пасьля канцэрту Вольскі сказаў журналістам, што гурту прыйшлося напачатку «заваёўваць залю», тыя толькі паціснулі плячыма... Зрэшты, было відаць, што энэрэмаўцы самі задаволеныя канцэртам. Вольскі прызнаў, што нячаста бачыў на сваіх канцэртах у Варшаве столькі людзей, а Піт нават казаў, што зрабіў некалькі памылак з прычыны «звышэмоцыяў».

«Нашыя «фірмова» выглядаюць і «фірмова» граюць! Ганаруся імі і тым, што гэты вечар тут, у Варшаве, цалкам наш», — пракрычаў мне ў часе канцэрту на вуха адзін знаёмы беларус. Ня ведаю, што да гэтага дадаць, бо адчуваў тое самае.

**Аляксей Дзікавіцкі, Варшава**



**Піт Паўлаў у клюбе «Proxima»**

# Загінуў Вася



**Васіль Шугалей на постэры «Не куры!!!» часопісу «Крыніца» (1990)**

19 сакавіка ў Менску пахавалі Васю Шугалея. Ягонае цела прывезьлі з Масквы, дзе апошнія некалькі год жыў гэты музыкант. Яго знаёмыя кажуць, што Васіль быў задушаны ў собскай кватэры шнуром ад кампутара: сутыкнуўся з кватэрнымі зладзеямі.

Постаць Шугалея — адна з самых яркіх на менскай рок-сцэне пачатку 90-х. Ён быў адным зь першых айчынных шоўмэнаў — яго выступы поўніліся пэрформансамі, правакацыямі ды жартаўлівай паэзіяй. Шугалей і ягоная група «Ы-Ы-Ы» была адкрыцьцём рок-фэсту «Тры колеры'1990», поруч з «Мрояй» ды «Бондай». Менавіта Васілю належыць аўтарства вершу, вельмі папулярнага ў маладзевых тусоўках 90-х:

Я бубу цябе ў губу.
Ты бубу мяне ў губу.
Я так болей не магу!
Я хачу бубу ў бубу!

У Шугалея была процьма праектаў, зьвязаных ня толькі з музыкай, але і з графікай. У Менску ладзіліся ягоныя выставы. Але ў сярэдзіне 90-х Васіль завязаў з панк-музыкай, зьехаў у Маскву, пісаў тэксты для расейскіх поп-зорак. Самая вядомая яго песьня — «Ветер знает» для групы «Браво». Менавіта ён адкрыў расейскай шоў-эліце «Ляпіса Трубяцкога».

**Сяргей Будкін**

БІБЛІЯТЭКА ЛЯВОНА БАРШЧЭЎСКАГА

# Койвіста па-беларуску

Сёньняшнія перакладныя кніжкі па-беларуску зьяўляюцца збольшага ў залежнасьці ад фундатара такіх выданьняў: нават уключаныя ў абавязковую школьную праграму (!) творы мастацкай літаратуры дзяржаўнымі выдавецтвамі гадоў пяць не выпускаюцца зусім. Пра студэнтаў беларускамоўных аддзяленьняў філфакаў даўно ніхто ня думае, ня кажучы ўжо пра звычайнага чытача, які ўсё-такі існуе. Вось жа, гэтаму чытачу будзе цікава пазнаёміцца з кніжкай, выпушчанай адным з тых нешматлікіх прыватных выдавецтваў, што ня маюць алергіі на беларускую мову.

Людзям не зусім маладога веку імя аўтара кнігі, Маўна Койвіста, добра вядомае: да 1994 г. ён быў прэзыдэнтам Фінляндыі й займеў на гэтай пасадзе аўтарытэт, надзвычай высокі як на дзяржаву, што не прывучаецца да «вялікіх».

Кніга «Ў школе і на вайне» сьведчыць, што гэты цікавы чалавек мае таксама нешараговыя літаратурныя здольнасьці. Ва ўсякім разе, яна вылучаецца з шэрагу шматлікіх мэмуараў заслужаных людзей, якія любілі апісваць «тое, што было не са мной». М.Койвіста піша пра сваю немалую жыцьцёвую дарогу са здаровым гумарам, нават іроніяй; яму зусім не ўласьцівы сындром «ба-альшога важджа». Вартасьць гэтай кнігі яшчэ і ў тым, што яна дадае нямала штрыхоў у сфармаваны ў нашай сьвядомасьці й падсьвядомасьці партрэт фінскай нацыі, а ў нечым яго й карэктуе.

Фінляндыя аднавіла і ўмацавала сваю дзяржаўнасьць намаганьнямі «мужыцкае нацыі», якая ня мела ўласнае шляхты, але мела натуральнае пачуцьце *свайго* — мовы, традыцыяў, культуры, гісторыі. Сам Койвіста паходзіў зь сям'і безьзямельнага селяніна, што не перашкодзіла яму — як і мностве іншых дзяржаўных асобаў краіны — стаць чалавекам інтэлігентным, адказным, дэмакратычным.

Асабліва цікавая беларускаму — як і любому постсавецкаму — чытачу будуць разьдзелы, прысьвечаныя эпосе другой сусьветнай вайны. У гэтай частцы кнігі М.Койвіста піша ня толькі пра свае ўласныя ўражаньні (а ён пачаў свой вайсковы шлях у 1939 г. з байца самаабароны, потым служыў у пажарных часьцях супрацьпаветранай абароны, а з 1942 г. — у пяхоце), але й дае, на падставе вывучаных гістарычных крыніцаў, аналіз прычынаў, хады і вынікаў як Зімовай («малой»), гэтак і ўсёй другой сусьветнай войнаў. Заканчваецца кніга апісаньнем першых паваенных гадоў…

**Койвіста М. У школе і на вайне:** Перакл. зь фінск. Я.Лапаткі. — Менск: Энцыкляпэдыкс, 2003




«У школе і на вайне» зьявілася па-беларуску дзякуючы рупнасьці адзінага пакуль што ў нас перакладчыка зь фінскае мовы Якуба Лапаткі — выхаванца наваполацкіх «Крыніцаў», які вось ужо больш за 10 гадоў жыве ў Хельсынкі. Якуб Лапатка не «залёг на дно», як шмат хто з нашых землякоў-эмігрантаў зь філялягічнай ды гістарычнай адукацыяй. Нягледзячы на сваё ўжо ня надта моцнае здароўе, ён працуе над перакладамі знакамітых раманаў Вэё Мэры і Мікі Валтары (урыўкі нядаўна друкаваліся адпаведна ў крынкаўскім «Годзе беларускім» і менскім «Дзеяслове»), робіць фінска-беларускі слоўнік, дапамагае палітуцекачам зь Беларусі і… сам шукае сродкі на выданьне сваіх перакладаў. Таксама й кніга М.Койвіста ўбачыла сьвет пры падтрымцы фундацыяў, зь якімі перакладчыку даваліся весьці няпростыя перамовы. У далейшых плянах Якуба Лапаткі — яшчэ і праца над перакладам кнігі пра Карла Густава Манэргайма.

**Лявон Баршчэўскі**

## Парыская прэмія Асьлюку

Рэжысэр Віктар Асьлюк атрымаў прыз «За найлепшы кароткамэтражны фільм» на міжнародным фэстывалі «Рэальнае кіно» ў Парыжы. Узнагароджаны ён быў за дакумэнтальную стужку «Кола».

«Рэальнае кіно» — адзін з найстарэйшых і найбольш прэстыжных фэстываляў дакумэнтальнага кіно ў Эўропе, на які адбіраецца 25 стужак з усяго сьвету. «Кола» ўжо атрымала да гэтага 3 прызы: на кінафэстывалі «Залаты Віцязь» за найлепшую рэжысуру, а таксама дыплём і спэцыяльную згадку экумэнічнага журы ў Ляйпцыгу.

## Тарас у ТЮГу

У Тэатры юнага гледача 18 сакавіка адбылася прэм'ера спэктаклю паводле п'есы Сяргея Кавалёва «Тарас на Парнасе». У спэктаклі ўдзельнічаюць Юры Жыгамонт (вядоўца тэлеграмы «Падарожжа дылетанта»), Уладзімер Іваноў, Дзяніс Арцюкоўскі, Аўгіня Жуковіч, гучыць музыка гуртоў «Стары Ольса» і «Ліцьвіны». Уласна ад аднайменнай паэмы ў спэктаклі засталося толькі некалькі цытатаў, якія ідуць эпіграфамі да пэўных сцэнаў.

## Сьпілбэрг + Барткевіч

Лявон Барткевіч, кіраўнік «Песьняроў», якія атабарыліся ў Маскве, заявіў у інтэрвію расейскай газэце «Новые Известия», што зьбіраецца ставіць мюзыкл «Мэлёдыі славянскага караля» і здымаць аднайменны амэрыканска-расейскі фільм. З амэрыканскага боку рэжысэрам нібыта мае быць Стывэн Сьпілбэрг, з расейскага — Андрон Канчалоўскі. Сьпілбэрг, паводле словаў Барткевіча, ужо даў папярэднюю згоду, Канчалоўскі яшчэ ня ведае пра прапанову.

## «Слуцкая» ў Гайнаўцы

У Музэі беларускай культуры ў Гайнаўцы (Польшча) 21—25 сакавіка пад патранатам пасла Беларусі ў Польшчы адбыліся Дні беларускага кіно. Паказвалі мастацкія, дакумэнтальныя і мультыплікацыйныя фільмы. Прывезьлі ў тым ліку «Настасьсю Слуцкую» і «Ў жніўні 44-га». Пасьля Гайнаўкі фільмы пакажуць у Беластоку, Бельску-Падляскім, Варшаве і Лодзі.

## Знайшлі бяз Холмса

У Вялікабрытаніі знайшлі колісь страчаную калекцыю асабістых папераў Артура Конан Дойля: асабістыя лісты (у тым ліку ад Чэрчыля, Уайльда, Рузвэльта), чарнавік першага твору пра Холмса «Эцюд у барвовых тонах» і накід партрэту славутага дэтэктыва.

Паперы зьніклі 40 гадоў таму, падчас падзелу спадчыны Конан Дойля, і цяпер знайшліся ў офісе адной лёнданскай юрыдычнай фірмы. Рарытэтная калекцыя коштам каля 2 млн фунтаў стэрлінгаў (амаль 3 млн 700 тыс. даляраў) 14 траўня будзе выстаўленая на аўкцыён «Christie's».

## Вулічная опэра

Майкл Экер мае паставіць опэру «Кармэн» у Сэвільі, дзе, паводле сюжэту, і адбываецца сама прыгода. Экер ужо ставіў у 1998 г. у Пэкіне опэру Пучыні «Турандот». Пастаноўка «Кармэн» адбудзецца падчас І Міжнароднага музычнага фэстывалю, што пройдзе з 2 да 12 верасьня.

Першыя два акты «Кармэн» будуць разыграныя на Гішпанскім пляцы (дзе зьвяцца дэкарацыі — тытунёвая фабрыка і таверна), трэці — на пляцы каля парку Марыі-Люізы, чацьверты — на арэне бою быкоў (Plaza de Toros de la Maestranza). Першыя тры акты змогуць убачыць восем тысяч гледачоў, чацьверты — яшчэ пяць тысяч. У вечар прэм'еры опэру здымуць на DVD.

## Тэстамэнт Шэкспіра ў Інтэрнэце

У Інтэрнэце зьявіўся аўтограф Уільяма Шэкспіра — тэстамэнт слыннага драматурга ад 25 сакавіка 1616 г., перададзены брытанскім архівам (www.documentsonline.pro.gov.uk/shakespeare.pdf). На інтэрнэт-сайце «DocumentsOnline» можна пабачыць запаветы іншых славутых брытанцаў, напрыклад Фрэнсіса Дрэйка ці Джэйн Остын.

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl**

**Сёлета 25 Сакавіка адзначаецца ў сталіцы ня маршам, а гуляньнямі. Што апранаць на гуляньні? Як апраналіся ў гэты дзень ў 1918 і 1988 гадах?**

**Увесну 1918 г., калі была абвешчаная БНР, у моду якраз уваходзілі доўгія свабодныя сукенкі бяз таліі з рукавамі «кімано» і падолам, завужаным даніз; капелюшы, суцэльна дэкараваныя, да прыкладу, кветкамі, і зручныя чаравічкі на невысокім абцасе. У той час увесь сьвет настройваўся на густы мадам Како Шанэль.**

**Гэта яна першай прыдумае, што кайстры можна насіць цераз плячо. Маленькая чорная сукенка, кішэні для цыгарэт у спадніцах і невялічкія элегантныя капялюшыкі — таксама яе прыдумка. Гэтая жанчына, якая ўсё дзяцінства насіла інтэрнатную форму, выгадавала ў сабе ня толькі фэнамэнальную працавітасьць, але і цьвёрдую ўстаноўку апрануць усіх жанчын па-свойму. Асноўны тагачасны канкурэнт мадам Како, спадар Крыстыян Дыёр, рабіў жанчын падобнымі да кветак, апранаючы іх у крыналін, зацягваючы таліі і напускаючы шматзначныя складкі на сьцёгны. У адрозьненьне ад яго антуражнай філязофіі, Шанэль увяла ў моду практычныя, строгія і функцыянальныя строі для сучасных лэдзі. Гэта быў сапраўдны гімн фэмінізму на подыюмах.**

**Мужчынскую ж моду ў Беларусі ў 1918-м дыктавала лінія фронту. Накладныя кішэні, скураныя рамяні, пагоны, кукарды... У кавалерыстаў — шпоры.**

**Небезьвядомая ў краіне модніца і актыўная ўдзельніца ўсіх сьвяткаваньняў Дня Волі Арына Вячорка асноўныя тэндэнцыі Дня Волі'88 успомніла адразу: джынсы-бананы (такія дзікія нагавіцы, моцна завужаныя ўнізе), гольфікі і куртачкі з рэглянам, доўгія, да сярэдзіны ікраў, спадніцы-шасьціклінкі з клёшнымі ўстаўкамі і расклёшаныя сукенкі, імітацыя пагонаў на цывільнай вопратцы, мяккія пінжакі на гузіках без падкладак і гарлавінаў, тканіну ў буйную чорна-белую клетку і доўгія парасоны цераз плячо, якія гублялі адразу па набыцьці. Стыль усё яшчэ моцна патыхаў 60-мі, эстэтыкай гіпі, натуральнасьцю тканінаў, колераў і мноствам этнаграфічных прыдумак. У часе штогадовых гуканьняў вясны дзейнічалі крыху інакшыя правілы. Гэта быў час адраджэньня ўсяго беларускага народнага: фольку, сьпеваў, вышыванак, ільну...**

**Спадарыня Арына ўспамінае, як вышывала крыжыкам на мужавых кашулях, уносіла шматлікія этнаграфічныя элемэнты ў звычайную вопратку, а пасьля абое «калупаліся над расшыфроўкай» значэньняў тых ці іншых сымбаляў. Той час можна лічыць зараджэньнем пазьней экстраактуальнага стылю фольк-мадэрн.**

**Людзі пэрыяду першых масавых сьвяткаваньняў Дня Волі ў сучаснай Беларусі ставіліся да вопраткі прыдзірліва: доўгага не насілі, кароткага не насілі; дзяўчаты апраналі «мінякі», толькі калі былі пэўныя ў бясспрэчнай прыгажосьці сваіх ног.**

**Як павінны выглядаць людзі, калі ў іх самае народнае і адначасова самае да непрыстойнасьці інтымнае сьвята? Якімі мы выходзім на волю і якімі мы рызыкуем сустрэцца зь ёй аднойчы, проста пасярод гораду, сьвету, пасярод гуляньня? Моды гэтай вясны — на старонках 8—14.**

# Быцьцё інакшым

## Моды гэтай вясны

**Выглядаць *дорага*, гаварыць *правільна* і паводзіцца *бездакорна*. На гэтых трох азначэньнях будуецца мода гэтае вясны. Аўтарытэты сэзону — здаровыя і сур'ёзныя. Трэнажорныя залі і калектыўныя сэансы ёгі поўняцца юнакамі і дзяўчатамі, якія цягаюць негазаваную мінэралку ў заплечніках, а на сьвяты дораць адно аднаму слоікі з журавінавым джэмам. Беларуская касмэтыка, бялізна, прадукты і алькаголь — таксама лідэры параду.**

Суметы з уласнага жаданьня ператвараюцца ў калюгі, а зранку ў прысадах заходзяцца лямантам першыя вясновыя прылятанцы. Разам з пахам бэнзыну, які пакінулі за сабой суседзкія аўтамабілі, у паветры тонкай ніткай прасьцiрaецца якая-небудзь ідэя... Адна з тых, якія нараджаюцца «за паўгадзіны да вясны» ў асяродках сьмелых і вальнадумных. Тых, каму своечасова «адарвала галаву», а яе кампанэнты склаліся ў прынцыпова новую сыстэму, здольную на нестэрэатыпную філязофію і нестэрэафанічныя подзьвігі. Яны — крыху эліта, крыху — інтэлігенцыя, а крыху — хуліганы. Яны ведаюць трохі болей, пасьпяваюць трохі хутчэй і спраўляюцца трохі спраўней. Яны — заканадаўцы моды і капітаны вялікіх тэндэнцыйных плаваньняў. Ва ўмовах Беларусі гэта азначае яшчэ й беларускамоўнасьць, беларусалюбства і ўласныя абгрунтаваньні таго факту, што менавіта ты — здольны, спрытны, кемлівы і разумны — застаешся жыць ТУТ.

Мы дачакаліся: любіць Беларусь уваходзіць у моду. Па-ранейшаму ня зьвязваючы свае перакананьні з палітычным вэрхалам і газава-бязгазавымі рэжымамі, клясьці патэнцыйных эмігрантаў на чым сьвет стаіць і з выглядам сытага чалавека перабіваць любога студэнта-кітайца: «А вось у нас тутака, у Беларуууууууусі...»

Беларуская касмэтыка, бялізна, прадукты і алькаголь — лідэры параду. Уся «фішка» ў тым, каб годна паказваць беларускі лэйбл на толькі што набытым тавары і, запэўніўшы ў яго бясспрэчных перавагах, разгромна і фэерычна паведамляць пра неверагодна нізкую цану.

Вясной 2004 г. грамадзкая сьвядомасьць падпадае пад уплыў усялякіх тэндэнцый «разьвіцьця сваёй асобы». Новыя прарокі навучаюць арыгінальнасьці, расьпісваючы па пунктах, як і што рабіць, каб быць *інакшым*. Свабода нарэшце пачынае зашкальваць і на нашай зямлі, а пячатак табу застаецца ўсё меней і меней. У грамадзтве дамінуе галівудзкая разьняволенасьць, назойлівы пошук «сваёй індывідуальнасьці», пытаньне «What I really am?» (**Чым** я ёсьць на самай справе?) — адно з самых істотных. Літаратура імкліва ператвараецца ў пералік уласных сэнсацыяў, паэзія — у суцэльны капусьнік, музыка — у нэапост-ньню-стылёвыя мяшанкі-баўтанкі і спалучэньні прыколаў, назьбіраных за ўсю музычную гісторыю XX ст.

Хваля вучэньняў «як трэба, каб было як хочацца» падрывае апошні давер да маскультуры, называючы Каэльё скончаным маркетынгавым графаманам і прымушаючы, як чорта лысага, абыходзіць паліцы з гуртовай колькасьцю ягоных «несьмяротных» пераплётаў у кнігарнях. У сьпісы непажаданага ўваходзяць таксама ўсе варыяцыі расейскіх дэтэктыўных раманаў і клянаваная «рамантычная камэдыі» ў вокладках, падобных да вокладак відэакасэт з адчайна банальным амэрыканскім жаноча-сямейным кіно. Вясна стымулюе начныя пачытанкі сусьветнай літаратурнай сьвежыны на мове арыгіналу ў Інтэрнэце. З пасьпяховым вынясеньнем слушнага вэрдыкту. І ніякай залішняй сьціпласьці пры яго публічным абвяшчэньні. Бо ўласнае мысьленьне — гэта рухавік, здольны трымаць яшчэ дзясятак калегаў за кошт сваёй мабільнасьці і энэргіі. Або няздольны ўтрымліваць і сябе самога.

Канцэптуальны пафігізм, як і беспрынцыповы рух «па плыні», паціху пакідаюць сьвежыя галовы на карысьць новых звычак складаць «пляны-максымумы» і абмяркоўваць тыя ці іншыя рэаліі без абмежаваньняў у зацікаўленасьцях. Новая вясна вітае прынцыповых і падрыхтаваных стварацьсваё жыцьцё па дасканала пралічаных графіках.

Аўтарытэты сэзону — багатыя і сур'ёзныя. Тыя, хто за пантовыя маркі адзеньня і здаровае харчаваньне. Агульныя тэндэнцыі — як заўсёды, з адставаньнем — даходзяць і да нас: трэнажорныя залі і калектыўныя сэансы ёгі поўняцца юнакамі і дзяўчатамі, якія цягаюць негазаваную мінэралку ў заплечніках, а на сьвяты дораць адно аднаму слоікі з журавінавым джэмам. Вечары, свабодныя ад вывучэньня навоўведзеных з другога сэмэстру нецікавых дысцыплін, праводзяцца на кватэрах, дзе ладзяць стылёвыя тэматычныя вечарынкі. Увогуле, модна быць у «тэме».

Сёлета вясна ўжо не нясе за сабой тэмы, зьвязаныя з чужымі нацыянальнымі адзнакамі (адмяняюцца кашулі a la кімано і панчохі з кітайскімі драконамі, арабскія ўпрыгожаньні, шапкі з вывязанымі сьцягамі і жахлівымі літарамі «NY»), замест гэтага — тэма папугаяў, шарыкі, кружкі, лініі, палоскі, кропкавая графіка, яскравыя колеры, эклектыка ў спалучэньнях, стрыманая геамэтрыя. Колеры часу: шмат яснага белага, на ім — цытрынавы жоўты і яблычны зялёны, апэльсынавы і насычаны індустрыйны сіні, пяшчотна ружовы, лілёвы і колер сасьпелага плоду манга. «Свабоду папугаям!» — крычаць сьвежыя нумары дзявочых часопісаў, і кожная ў ідэале мусіла б выпусьціць схаваную глыбока ўнутры птушку: папугая ці канарэйку. Ці варону белую.

Макіяж новай вясны не па-вясноваму ледзяны, поўны маркотнай футурыстычнай рамантыкі:



гладкая, роўная глянцавая скура і зіхоткія халодныя сьветлыя пэрлямутравыя колеры.

У сьвеце парфумы каралююць «зоркавыя» імёны і прозьвішчы. Няйначай і зоркавыя хваробы — пасьля салодка-прыкрых «NaoMagic» ад Наомі Кемпбэл ніхто з зорачак так і ня здолеў выдаць рынку сапраўдны водар. Гэтага не зрабілі ні горкаадэкалёнавая «Femine» ад Сіндзі Кроўфард, ні пабабску безгустоўныя «Live to Love» ад Сэлін Дыён, ні самая апошняя парфумная авантура Джэніфэр Лопэс пад назвай «Still». Замест таго каб верыць папсовым багіням, давярайце ўласнаму густу і нюху. Альбо, прынамсі, майму: самы вясновы пах для рашучай і незалежнай — «Simply» ад Clinique, для чыстай і цнатліва-недасягальнай — «Very Irresistible» ад Givenchy, для салодкай, цёплай і жаданай — «Chris 1947» ад Christian Dior. Пахі для яго: дзікага і неўтаймоўна гарачага — «Memoire D'Homme» ад Nina Ricci, для яго, мляварытомленага зімой, — «Higher Energy» ад Dior. Незалежна ад сэзону — «Hugo Deep Red», «Dark Blue» і проста «Hugo Boss».

Модна пахнуць і выглядаць *дорага*, гаварыць *правільна* і паводзіцца *бездакорна*. На гэтых трох азначэньнях будуецца новы сьвет новай сонечнай і паветранай, прасторнай і цяпліва вычаканай вясны. І альтэрнатыва ім можа быць толькі адна: выглядаць, гаварыць і паводзіцца ПА-СВОЙМУ. Магчыма, усе тэндэнцыі толькі для таго і зьяўляюцца, каб своечасова быць адмоўленымі на карысьць сябе, сваіх кніг, сваёй музыкі, свайго выгляду і сваёй вясны №2004.

**Тэда Лі**

# Гульня паводле правіл

Мода — панятак таталітарны. Гэтым дакладным тэрмінам пазначаюць *паноўны* на пэўным адрэзку часу стыль. Сёньня гэта акурат тая культура масавае спажывы, што акаляе нас нават насуперак нашай волі. Бэльлі-данс і расейская папса, малагабарытныя «Škod'ы» і «Renault», караоке-сыстэмы, зялёныя гарбаты й сушы...

Таталітарызм моды прагне трываласьці, усюдыіснасьці й доўгатэрміновасьці. Паўстагодзьдзя мы дыхаем «Chanel №5»! Моднымі да сёньня застаюцца строі ад Вэрсачэ, якога даўно няма ў жывых, альбо тысячу разоў прамоўленае з прыдыханьнем экранаў: «Rolex».

Нішто гэтак не ілюструе таталітарнасьць моды, як мужчынскія строі. Мы паўтараста гадоў насілі фракі. І весь ужо столькі ж часу носім клясычныя гарнітуры пад гальштукам. Як часам заўважаюць у турыстычных даведніках — «эўрапейскага тыпу».

Мы становімся закладнікамі масавых густаў, ад якіх залежыць і палітыка тэлебачаньня, і нават асартымэнт нашых харчовых прадуктаў. Мы мусім лічыцца з глябальнымі правіламі прынагоднага нашэньня строяў і парадку спажываньня ежы.

Мода — панятак элітарны. Заўсёды заканадаўцамі моды станавіліся прывілеяваныя асобы з экстравагантнымі паводзінамі: Людовік XIV і мадам Пампадур, Сальвадор Далі й Эндзі Ўоргал.

Адзінкі могуць пахваліцца веданьнем найноўшых павеваў моды. Вось, здавалася б, толькі ўчора былі модныя водары ад «Massimo Dutti», а сёньня куды там... Літаральна ўчора эстэты багомілі новаадкрытых Віяна, Гары альбо штукара Зюскінда, а сёньня гэта ўжо старасьвеччына...

З паўтысячы дамоў моды, некалі сусьветна вядомых, сёньня застаўся хіба тузін. Адпаведна і ўсё больш неймавернымі становяцца цэны на модныя рэчы ад іх. Несупынна даражэюць паслугі культавых дызайнэраў і дойлідаў. Рэчы ператвараюцца літаральна ў «рэчы ў сабе».

Мода — панятак рэвалюцыйны. Ад XIX ст. нанканфармізм уважаецца за праяву *моднасьці*. Хустка лорда Байрана ці інтымнае жыцьцё Оскара Ўайльда, экзатычныя падарожжы Дэлякруа ці філязофскія навацыі Ніцшэ. Калі дакладна хочаш быць модным — будзь на крок наперадзе ўсіх. Пратэстуй супраць прынятае моды — і ўзаб'ешся ўгару. Гэтак у сьвеце адзежы былі зробленыя рэвалюцыі: у 1891 г. — з вынаходтвам зашпілкі-маланкі Ўіткамам Джадсанам; ці ў 1939 г. — паказам у Нью-Ёрку нэйлёнавых панчохаў. Былі й хвалі моды на стылі гіпі альбо панкаў. Хто ведае, што чакае нас за новым паваротам.

Але ў любым разе, мода — гэта *правілы*, што альбо дакладна *выконваюцца*, альбо татальна *парушаюцца*. І выбар — толькі за табой.

**Сяргей Харэўскі**



**Сярод новых дзіўнаватых модаў сярэдняе клясы — керлінг, шатляндзкая гульня, «руханьне каменя». Першы чэмпіянат Беларусі па гэтым спорце з удзелам сямі камандаў адбыўся ў Менску. Для перамогі ў керлінгу патрэбныя дакладнасьць і разьлік.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Бізнэсоўцы лезуць на сьцены

**Яшчэ яны займаюцца айкідо, танчаць капаэра, іхныя жанкі — танец жывата, а ўзімку яны сем'ямі выпраўляюцца пад Лагойск катацца на снаўбордах. Як яшчэ бавіць вольны час беларуская сярэдняя кляса?**

Танчыць танец жывата бяз ладнага жывоціка немагчыма, таму многія прадстаўніцы сярэдняй клясы выкарыстоўваюць новае хобі як сродак пазбавіцца комплексаў адносна памеру сваёй таліі. Дактары сьцьвярджаюць, што падчас танцу адбываецца масаж унутраных органаў.

Ці модна есьці бульбу? Не. Чаму? Бо гэта робяць тут амаль усе. Ці модна лётаць у адпачынак на ўласным самалёце? Не. Чаму? Бо гэтага ня робіць тут амаль ніхто.

Мода — дзіця попыту і прапанаваньня. Недасягальнае ня можа быць модным. Таму ў Беларусі дужа пашыраная псэўдамода — вынік аднастайнасьці рынку. Памятаеце бум кітайскіх пухавікоў на пачатку 90-х? Уся краіна хадзіла ў фіялетавых, зялёных ды блакітных куртках, якія зьдзьмухваліся ды спаўзалі, ня вытрываўшы і аднаго сэзону. Але хіба тады прадавалася што іншае? Дый цяпер паўсюль на рынках тавар адзін і той жа, толькі цэны вагаюцца на пару даляраў.

У нас няма такога, як у Японіі, дзе тысячы згодныя стаяць ноч у чэргах, каб набыць новую электронную забаўку. Няма ў нас і такога, як у Эўропе, дзе тавар атрымлівае магутную раскрутку ў мэдыях, а потым шаноўнае бюргерства ахвотна выкладае свае эўра за новую бразготку «en vogue». Мода па-наску — гэта калі нешта шырока папулярнае ў вузкіх колах. Галоўная прычына гэтага банальная: толькі ў некаторых хапае вольных грошай на модныя рэчы ды забавы.

Масавую моду ствараюць не багатыры ці жабракі, а сярэдняя кляса. Яна ў нас ня дужа вялікая, таму й мода нямасавая. Як найбольш модна забіваць вольны час сярод прадстаўнікоў нашай сярэдняй клясы?

Галоўная тэндэнцыя — адпачынак павінен быць карысным для здароўя. Летась адчыніліся гарналыжныя комплексы ў Лагойску ды Курасоўшчыне. Ехаць у Закапанэ ці Альпы зрабілася неабавязкова, і горныя лыжы ператварыліся ў папулярны адпачынак. Але сапраўдныя моднікі набываюць ня лыжы, а снаўборд. На тых, хто езьдзіць «з палкамі», паглядаюць, як на замшэлых кансэрватараў. Праўда, існуе рэальная небясьпека таго, што снаўборд хутка стане банальнасьцю і лыжы зноў увойдуць у моду.

Вырасла цікавасьць і да ўсходніх адзінаборстваў, у першую чаргу да айкідо. Гэта майстэрства абараняцца, атака ў ім мае другарадны характар. Сэнс у тым, каб зьвярнуць нэгатыўную энэргію ворага супраць яго самога.

Сапраўднага майстра айкідо практычна немагчыма ўдарыць — удары трапляюць міма, а сам зламысьнік па інэрцыі ляціць на падлогу. У ідэале, чым мацней вораг б'е, тым горш сябе калечыць. Вельмі беларускі спорт. Бізнэсмэны ходзяць на айкідо вучыцца канцэнтраваць унутраную энэргію — гэта выпрацоўвае моц духу, такую неабходную ў спрэчках зь незгаворлівымі партнэрамі.

З Эўропы да нас пакрысе перабіраецца мода на капаэру — бразыльскі народны спорт. Гэта сынтэз танцу з баявым майстэрствам ды музычнай імправізацыяй. Пара танцораў нібы спаборнічае, ледзь ня зносячы адзін аднаму сківіцы пятамі. Астатнія ўдзельнікі танцу сядзяць вакол, граючы на музычных інструмэнтах, падпяваючы ды пляскаючы ў ладкі.

Пакуль мужчыны разьмінаюць мускулы ў спартовых залях, кабеты таксама не губляюць часу. Апошнім часам многія беларускі захапіліся танцам жывата, які дазваляе сумясьціць прыемнае з карысным, сагнаць лішні тлушч. Танчыць танец жывата бяз ладнага жывоціка немагчыма, таму многія прадстаўніцы сярэдняй клясы выкарыстоўваюць новае хобі як сродак пазбавіцца комплексаў адносна памеру сваёй таліі. Дактары сьцьвярджаюць, што падчас танцу адбываецца масаж унутраных органаў, лякуецца няплоднасьць ці, прынамсі, робіцца яе прафіляктыка. Жанкі вучацца танчыць танец жывата ня толькі для сябе, але і для мужоў, якія за працай ды карпаратыўнымі вечарынамі пачынаюць забывацца на жонак. А тут — такая экзотыка ўвечары пасьля працы...

І, нарэшце, яшчэ адна мода з-за мяжы — лазаньне па сьценах, гэткі сабе від гарадзкога альпінізму. Займаецца ім у асноўным моладзь, бо спорт вымагае вялікіх фізычных высілкаў. У спэцыяльную бэтонную сьцяну ўмацаваныя невялічкія выступы розных колераў (каб лягчэй было іх заўважыць), за якія «альпініст» трымаецца, караскаючыся ўгару. Выдатная трэніроўка для пальцаў, біцэпсаў ды трыцэпсаў, расьцяжка для ног.

Сапраўдная вясна разам зь цёплым сонейкам мусіць прынесьці й новую моду. Сачыце за тэндэнцыямі.

**Алесь Кудрыцкі**

# Менскія цыбульні

Сярод мноства адказаў на пытаньне «А можа, так трэба?» беларус нязьменна абярэ варыянт «Так трэба». У дачыненьні да непісьменных шыльдаў Менску гэтае правіла спрацоўвае на ўсе сто. «Так трэба!» — гаварылі самі сабе жыхары сталіцы, убачыўшы чарговую бязглуздзіцу, кшталту «Боты выробляюцца са скуры заказчыка». Або шыльду з надпісам «прашпект Францішка Скарыны», якая ў 1991-м замяніла «проспект Ленина». Цэлае пакаленьне палічыла слова «прашпект» за ўзор ды пачало заўзята «прашпектаць». За кароткі тэрмін шыпячая альтэрнатыва амаль выціснула сьвісьцячую норму. Тым часам літара «ш» была ўсяго толькі памылкай афармляльніка. А здаралася, што чары непісьменнай шыльды выклікалі буйныя канфлікты, як тое адбылося з надпісам «Цыбульня».

На пачатку 90-х у адным зь менскіх мікрараёнаў рабочыя прымацоўвалі шыльду «Цырульня» з пасобных мэталёвых літараў. Рабілі тое нападпітку, да таго ж цёмначы, таму зафіксавалі літару «р» дагары нагамі. Атрымалася штосьць сярэдняе паміж «d» ды прапісным «б». Тым самым рабочыя ўзбагацілі беларускую мову сымпатычным наватворам «Цыбульня». Якраз для абазначэньня спэцыялізаванае крамы, замест пастылага «Садавіна-гародніна».

Прагматычныя менчукі не зьдзівіліся ані каліўца: калі ўлады зрабілі шыльду — значыць, ёсьць такое слова. Пальцам на яго ніхто не паказваў і скаргаў нікуды не дасылаў. А ў мужчынскую і жаночую залі навасьпечанай «Цыбульні» пачалі залятаць бабулькі з пыльнаватымі торбамі, зірклівымі вачыма ды пытаньнямі кшталту: «Жанчынка, а дзе тут у вас буракі?» Майстрыхі палка абмяркоўвалі, чаго бабуленцыі ходзяць сюды. Бо агурковы ласьён — адзіная рэч у цырульні, якая хоць неяк нагадвае сельскагаспадарчую прадукцыю. Ад тых абмеркаваньняў цярпеў кліент. Захапіўшыся бабулькамі, цырульніцы замест «паўбоксу» абціналі пад «бокс», замест «боксу» — «пад нуль», а кліент, які меўся быць падстрыжаным «пад нуль», ледзь не сыходзіў з жыцьця. Ізноў крык, сварка — цяпер ужо зь незаслужана абалваненымі наведнікамі. Толькі праз два тыдні ляпсус заўважылі самі майстрыхі. Тым самым спыніўшы ўцягваньне цырульні ў бездань усеагульнага шаленства і магчымага кліентазабойства.

А вось бібліятэка, што месьціцца на вул. Талбухіна, 14а, дагэтуль носіць «імя цёткі». Тады ўжо і Цэнтральную навуковую бібліятэку імя Якуба Коласа трэба перайменаваць у «Бібліятэку дзядзькі Якуба» ці проста «дзядзькі», а новую Нацыянальную — у «Бібліятэку бацькі».

Ёсьць выпадкі, калі цяжка вызначыць, хто вінаваты ў ляпсусах. Напрыклад, надпіс «Крама» на аднайменным аб'екце па пр.Машэрава, 75 зроблены дагары нагамі. Выдае на тое, што ён разьлічаны на самагубцаў, якія скачуць з шматпавярховікаў уніз галавой. А што калі за колькі імгненьняў да бруку ім заманіцца выпіць бутэлечку «Крыніцы» або падсілкавацца «Алёнкай»? Карацей, калі зрабілі — так трэба было!

Наастатак — без камэнтароў. «Выраб ювэлірных вырабаў» — надпіс на вітрыне крамы па вул.Якуба Коласа, 67.

**Павел Касьцюкевіч, Менск**

# У Цімкавічах

За дзесяць кілямэтраў ад Капыля, у мястэчку Цімкавічы, у 20-я жыў і працаваў Кузьма Чорны. Там, у цэнтры паселішча, на пагорку, стаіць і цягліны дом-музэй яму з шыльдачкай над уваходам.

А вось на чыгуначным прыпынку мястэчка шыльда з часоў савецкай імпэрыі нязьменная — «Тимковичи», з мэтровага памеру літарамі. Што ўсё ж радуе — на 40-кілямэтровым адрэзку чыгункі ад Слуцку да Цімкавіч усе назвы прыпынкаў беларускамоўныя, чаго не заўважаюць цімкаўцы. Бо насупраць дому-музэю славутаму земляку, на магазынах, што ўзбоч ходнікаў на галоўнай вуліцы, шыльды спрэс расейскамоўныя: «Овощи», «Промтовары» і г.д. Нібы на зьдзек тым, хто ўшаноўвае памяць аб сваім земляку, пакутніку таталітарнай сыстэмы, што без пары абарвала ягонае жыцьцё. І гэтыя шыльды нікога з настаўнікаў сярэдняй школы, будынак якой за пяцьдзясят крокаў ад музэю, не наводзяць на роздум, жаданьне нешта выправіць — праходзяць безуважліва, быццам так і трэба.

Па шляху чыгункі адразу за Цімкавічамі яшчэ адзін прыпынак нясе назву перабудовачнага часу — «Труд», як аднайменны суседні калгас. Добра яшчэ, што далей, да самых Баранавічаў, прыпынкі набылі беларускамоўныя назвы.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

# Форум

На інтэрнэт-форуме сайту «Нашай Нівы» (www.nn.by) чытачы таксама выказваюць меркаваньні пра публікацыі й падзеі ў краіне й сьвеце.

**Omu,**
13.03.2004, 06:13

Сябры, некалькі гадоў не чытаў «НН» (роўна як і іншых газэтаў), хаця раней яе выпісваў. А нядаўна не ўтрымаўся, купіў апошні нумар.

Уражаньні ранейшыя: востраў Крым. З аднаго боку — дасканалая беларуская мова, чытаць — асалода. Актыўная словатворчасьць. Дух свабоды. Дзякуй!

Але, як і раней, пабачыў у газэце нейкую абстрактную Беларусь палітыкаў, паэтаў і мастакоў. Быццам бы і няма рэальнай вытворчасьці, энэргетыкі, прыкладных НДІ і фундамэнтальнай навукі, якая забясьпечвае нашым паэтам магчымасьць свабоднага самавыяўленьня. Быццам бы эканоміка — гэта газавая труба, а не станкі і інфармацыйныя тэхналёгіі. Быццам бы кожны тыдзень беларускай стабільнасьці не азначае месяца безнадзейнага тэхналягічнага адставаньня ад нестабільных краінаў, дзе людзі маюць мужнасьць самастойна вырашаць свае праблемы, а не шукаць усюды вінаватых... Прабачце, набалела.

Яшчэ раз дзякую за «НН»!

**З павагай, Міхал**

**Аксана Новікава**
12.03.2004, 13:15

Калі пачынаеш чытаць газэты, то ўсіх спрабуюць пераканаць, што Пуцін ня любіць Лукашэнкі так, як мужык з показак — цешчы. Што трэба толькі не прагаліць моманту, калі «добры дзядзька» скіне Лук-у. І тады тэрмінова кідаць недаедзеныя бутэрброды на якой-небудзь новай прэзэнтацыі «чакаючых» і бегчы займаць вызваленае месца на К.Маркса, 38. Гэта што, «глупства» ці «здрада»?

Зь незадаволенымі ўладай ніхто працаваць ня хоча. У мяне знаходзіцца больш за 500 подпісаў незадаволеных дзеяньнямі Мінгарвыканкаму з нагоды рэканструкцыі гораду, дык ні адну газэту гэта тэма нават не зацікавіла. Падумаеш, нейкія незадаволеныя! Вось крыкне барын Маскоўскі!

Усё ж такі прызвычаіліся ў нас на прыклад Расеі і Лукашэнкі лічыць народ ЭЛЕКТАРАТАМ, а прасьцей — статкам, які зьесьць усё тое, што яму падсунуць «багатыя ды знакамітыя». Не, спадары! Беларусы — ня статак!

**Microtus,**
12.03.2004, 22:00

Ва ўсёй Эўропе дзень жалобы. Але ў Беларусі нават калі свае людзі згараілі, улады і не падумалі пра гэта, таму — што ім нейкія гішпанцы...

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

## АФІША

### Купалаўскі тэатар

**26 і 28 сакавіка** (пт і ндз), раніца — мюзыкл «Афрыка» У.Кандрусевіча і Л.Пранчака

**26 сакавіка** (пт) 19.00 — крымінальная меладрама «Кім» А.Дударава

**28 сакавіка** (ндз) 19.00 — драма «Згублены рай» А.Курэйчыка

**28 сакавіка** (ндз) 19.00, малая сцэна — японская гісторыя «Дом, дзе сьпяць прыгажуні» Д.Хуана

**31 сакавіка** (ср) 19.00 — «С.В. пляступныя спэктакль» паводле п'есы А.Чэхава «Вішнёвы сад»

### Опэра

**25 сакавіка** (чц) 19.00 — «Травіята» Дж.Вэрдзі

**27 сакавіка** (сб) 11.30 — «Кот у ботах» Ц.Кюі

**27 сакавіка** (сб) 19.00 — «Тоска» Дж.Пучыні

**30 сакавіка** (аўт) 19.00 — «Яўген Анегін» П.Чайкоўскага

### Балет

**26 сакавіка** (пт) 11.30 — «Чыпаліна» К.Хачатурана

**26 сакавіка** (пт) 19.00 — «Макбэт» В.Кузьняцова і «Балеро» М.Равэля

**28 сакавіка** (ндз) 11.30 — «Беласьнежка і сем гномаў» Б.Паўлоўскага

**28 сакавіка** (ндз) 19.00 — «Дон Кіхот» Л.Мінкуса

**31 сакавіка** (ср) 19.00 — «Карсар» А.Адана, Ц.Пуні, Л.Дэліба, Р.Дрыга і П.Альдэнбурскага

### Тэатар імя Горкага

**25 сакавіка** (чц) 19.00 — інтымныя сцэны з жыцьця людзей і багоў «Амфітрыён»

**26 сакавіка** (пт) 19.00 — камэдыя «Адзіны спадкаемец» Ж.-Ф.Рэньяра

**27 сакавіка** (сб) 11.00 — камэдыя «Джэльсаміна ў Краіне Хлусаў» Дж.Радары

**27 сакавіка** (сб) 19.00 — драматычная містэрыя «Пакаяньне Марыі» П.Кляйля (прэм'ера)

### Музычны тэатар

**25 сакавіка** (чц) 19.00 — рамантычная музычная камэдыя «Севастопальскі вальс» К.Лістова

**26 сакавіка** (пт) 19.00 — музычнае шоў «Галактыка каханьня»

**27 сакавіка** (сб) 11.30 — мюзыкл для дзяцей і дарослых «Айбаліт-2002» І.Левіна

**27 сакавіка** (сб) 19.00 — карнавал «Ноч у Вэнэцыі» І.Штраўса

**28 сакавіка** (ндз) 11.30 — мюзыкл для дзяцей і дарослых «Бураціна.by» А.Рыбнікава

**28 сакавіка** (ндз) 19.00 — апэрэта «Кажан» І.Штраўса

**30 сакавіка** (аўт) 19.00 — апэрэта «Каралева чардашу» І.Кальмана

**31 сакавіка** (ср) 19.00 — вечар балету: «Кармэн-сюіта» Ж.Бізэ і Р.Шчадрына ды «In pivo veritas»

### Моладзевы тэатар

**25 сакавіка** (чц) 19.00 — камэдыя «Шалёны дзень, ці Вясельле Фігаро» П.-А.Бамаршэ

**26 сакавіка** (пт) 19.00 — мэлядрама «Позьняе каханьне» А.Астроўскага

**27 сакавіка** (сб) 19.00 — камэдыя «Страсьці ў Віндзоры» У.Шэкспіра

**28 сакавіка** (ндз) 19.00 — камэдыя «Хітрая закаханая» Лопэ дэ Вэгі

**31 сакавіка** (ср) 19.00 — камэдыя «Акадэмія сьмеху» Кокі Мітані

### Рэспубліканскі тэатар драматургіі

**25 сакавіка** (чц) 19.00 — «Чарнобыльская малітва» С.Алексіевіч (сумесны франка-беларускі праект)

**26 сакавіка** (пт) 19.00 — гістарычная драма «Понцій Пілат» А.Курэйчыка (прэм'ера)

**28 сакавіка** (ндз), раніца — мюзыкл-пародыя «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй» У.Аксенкруга

**28 сакавіка** (ндз) 19.00 — дэтэктыў плюс... «І рэха адказала — ты (Ляфантэн)» М.Рудкоўскага

**31 сакавіка** (ср) 19.00 — «Жанчыны Бэргмана» (сумесны франка-беларускі праект)

### Тэатар юнага гледача

**25 сакавіка** (чц) 16.00 — сцэнічная вэрсія тэатру паводле аповесьці Э.Портэр «Паліяна»

**26 сакавіка** (пт) 11.00 — «Палёт у краіну мрояў» М.Варфаламеева

**26 сакавіка** (пт) 19.00, экспэрымэнтальная сцэна — «Апошняя дуэль» М.Лявончыка і Н.Башавай

**27 сакавіка** (сб) 11.00, 14.00 — «Парася, якое сьпявае» С.Казлова

**28 сакавіка** (ндз) 16.00 — «Маленькі лорд Фаўнтлерой» М.Воранава паводле аповесьці Ф.Бэрнэт

**30 сакавіка** (аўт) 18.00 — «Стваральніца цуду» У.Гібсана

**31 сакавіка** (ср) 18.00 — «Палачанка» А.Дударава

### «Дзе-Я»

**26 сакавіка** (пт) 19.00 — гісторыя каханьня «Рамантыкі» Э.Растана

**27 сакавіка** (сб), раніца — казка «Чарадзейная скрыпка» Алеся Гаруна

**28 сакавіка** (ндз) 19.00 — лірычная камэдыя «Квадратура круга» В.Катаева

**30 сакавіка** (аўт) 19.00 — камэдыя «Чай зь вярблюдам» Г.Марчука

### Тэатральны праект «Віртуозы сцэны» (на сцэне Дому афіцэраў)

**27 сакавіка** (сб) 12.00, 16.00 — Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны дзіцячы музычны тэатар імя Сац

**28 сакавіка** (ндз) 12.00 — мюзыкл для дзяцей і дарослых «Крэсіва» Г.-Х.Андэрсэна

### «Калекцыянэр»

**28 сакавіка** — (ндз) у 18.00 у Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3) у рамках выставы Алеся Родзіна «The second penetration into Tacheless» адбудзецца паказ п'есы Вольгі Гапеевай «Калекцыянэр». Удзельнічаюць: Альгерд Бахарэвіч, Віктар Жыбуль, Вальжына Морт, Джэці і інш.

## ВЫСТАВЫ

**Палац мастацтваў** (вул.-Казлова, 3)

**З 20 сакавіка** да канца месяца — выстава жывапісу Алеся Родзіна

**Да 29 сакавіка** — выстава жывапісу Ігара Ўласава

**Музэй гісторыі і культуры** (вул.Маркса, 12)

Выстава «Пошукі і знаходкі» (па выніках 10 гадоў археалягічных дасьледаваньняў)

**З 4 сакавіка па 6 красавіка** — жывапіс і графіка сям'і Івановых «Фамільныя каштоўнасьці»

**З 5 сакавіка па 6 красавіка** — выстава творчасьці Валер'я Назарава

**Музэй гісторыі кіно** (вул. Багдановіча, 15)

Выстава касьцюмаў і рэквізыту да фільму «Настасься Слуцкая» з паказам кінастужкі на групавых наведаньнях

**Галерэя «Славутыя майстры»** (Траецкае прадмесьце, Камунальная набярэжная, 6)

Выстава керамікі Ліліі Нішчук «Усе мы трохі чайнікі» (пастаянная экспазыцыя)

Выстава батыку Вадзіма Ўдавенкі «Карціны са старой сьцяны» (пастаянная экспазыцыя)

**Музэй гісторыі вайны** (пр.Скарыны, 25а)

**Да 1 красавіка** — выстава «Сямейны альбом»

**Да 30 красавіка** — выстава «Беларускі ваенны жывапіс» (творы пэрыяду 1945—2000 г.)

**Мастацкая галерэя «ONIK»** (вул.Сьвярдлова, 4)

**Да 2 красавіка** — выстава жывапісу Дзянісa Барсукова

## КІНААФІША

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Скарбы Амазонкі»: **26—28** (пт—ндз) 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00, 21.10.

«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **26—28** (пт—ндз) 15.30, 17.30, 19.20.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«Дзюплекс»: **26** (пт) 14.00, 16.20, 21.00; **27, 28** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 21.00.

«Іншы сьвет»***: **26—28** (пт—ндз) 18.30.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Дом зь пяску і туману» (прэм'ера): **26** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **27, 28** (сб, ндз) 13.40 (іл), 18.30.

«Каханьне паводле правілаў... і без» (прэм'ера): **27, 28** (сб, ндз) 16.00, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)

«Буйная рыба» (прэм'ера): **26** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **27** (сб) 15.00, 17.00; **28** (ндз) 15.00 (іл), 17.00.

«Каханьне паводле правілаў... і без» (прэм'ера): **27, 28** (сб, ндз) 19.00, 21.10.

**«Мір»** (284-37-71)

«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **26—28** (пт—ндз) 14.00, 15.50.

«Апошні самурай»: **26—28** (пт—ндз) 18.00, 20.40.

«Цяжкасьці перакладу»: **26** (пт) 19.00, 21.10; **27, 28** (сб, ндз) 16.40, 19.00, 21.10.

**«Перамога»** (223-77-66)

«Дзень Хамячка»: **26** (пт) 15.00.

«Апошні самурай»: **26** (пт) 17.00, 20.00; **27, 28** (сб, ндз) 14.00 (іл), 17.00, 20.00.

**«Піянер»** (227-64-87)

«S.W.A.T.: спэцназ гораду анёлаў»: **26** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **27, 28** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

**«Цэнтральны»** (227-34-16)

«Чумавая пятніца»: **26** (пт) 12.00, 16.30, 21.00; **27, 28** (сб, ндз) 13.30, 18.00.

«Буйная рыба» (прэм'ера): **26** (пт) 14.00, 18.30; **27, 28** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.30, 20.30.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)

**Юнаму гледачу:** фэстываль дзіцячых фільмаў «Сакавічок»

**«Аўрора».** «Гуляй як Бэкхем»: **26—28** (пт—ндз) 11.00.

**«Берасьце».** «Гонар маю»: **26** (пт) 10.30.

«Кніга джунгляў-2»: **27, 28** (сб, ндз) 12.00.

**«Масква».** «Карлік Нос»: **27, 28** (сб, ндз) 13.00.

**«Мір».** «Блізард»: **26** (пт) 10.30, 15.00; **27, 28** (сб, ндз) 13.00.

**«Піянер».** «Тайна Блакітнай даліны»: **26** (пт) 10.15, 12.00, 14.00; **27, 28** (сб, ндз) 11.15.





**Віленскія моднікі і модніцы арыентуюцца на Парыж. Калі ў іх запытацца, яны аднагалосна так і адказваюць: «Як гэта, што цяпер модна ў Вільні? Ясна — тое ж, што і ў Парыжы. Толькі па-віленску». У Вільні ўвесну, як і заззвычай, модныя арыгінальнасьць, этна-матывы, навізна, добры настрой, самаўпэўненасьць, камфорт — усё тое, дзеля чаго працуюць дызайнэры, візажысты. Прынамсі, гэтак яны цьвердзяць. І ўвесну ім асабліва хочацца верыць. Не дзеля таго ж, урэшце, прыдумляюць яны новыя мадэлі, каб толькі спусташаць нашыя кішэні.**

# Скандалы як рухавік

## Што модна ў Вільні

Модныя крамы падрыхтаваліся да сэзону. Заангажаваныя моднікі набываюць навінкі зь веснавых калекцыяў. Віленчукі ацэньваюць новыя прыдумкі з настальгіяй па 50-х альбо нават па 20-х — кшталту налёту буржуазнасьці ды вяртаньня джазу, наракаюць, што веснавая спартовая калекцыя «Nike» выглядае не зусім новай. Цешацца, што модны цяпер абутак больш прыдатны да віленскай брукаванкі.

Пакуль літоўскія дызайнэры заваёўваюць Маскву новымі калекцыямі (ідзецца ня толькі пра футры «Nijolė», пра іх увогуле ня згадваем — бо вясна), віленскія моднікі і модніцы арыентуюцца на Парыж. Калі ў іх запытацца, яны аднагалосна так і адказваюць: «Як гэта, што цяпер модна ў Вільні? Ясна — тое ж, што і ў Парыжы. Толькі па-віленску».

### Кніжка-кайстра на плячы...

Таму, каб знайсьці шлях да сваёй публікі, літоўскія дызайнэры зьбіраюцца ў Парыж. Асабліва тыя, хто Маскву ўжо заваяваў. Вось дызайнэрскі літоўскі дуэт «A&V» (А.Пагрэбноюс і В.Сіманавічутэ) сёлета зноў дзівіць арыгінальнымі дэталямі — кайстры накшталт кніжак з надпісамі кшталту «L.Tolstojus. «Karas ir taika» (Л.Талстой. «Вайна і мір»), шалі ў выглядзе сымпатычных зьвяркоў, пальчаткі на адзін палец, надпісы з падтэкстам на вопратцы. Імя на міжнародным рынку моды «A&V» заваявалі праз Маскву. Цяпер, каб заваяваць Вільню, трэба ў Парыж, куды гэтых дызайнэраў ужо запрасілі.

### ...і бялізна навідавоку

«A&V» мяркуюць, што славу ім прынесла пачуцьцё гумару. Бо віленскі кшталт прадугледжвае, апрача іншага, адмысловы гумар. На кожную модную прапанову віленскія жартаўнікі маюць паказку з гісторыі даўняй ці ня вельмі. Такім чынам адаптуюцца самыя розныя навамоднасьці. Да прыкладу, прыносіць новы сэзон моду «бялізна — навідавоку». Цяпер чым болей яна будзе відаць, тым мадней. Флягманы куцюру, кшталту Christian Dior або «Dell`Aqua» ці «Costume National», робяць усё, каб фарсуны прахадзілі ўсю вясну ні голыя, ні апранутыя. А віленчукі ў каля-модных он-лайнавых чатах адразу прыгадалі вядомую ў Прыбалтыцы гісторыю: па вайне жанкі расейскіх вайскоўцаў, упершыню пабачыўшы карункавыя споднія кашулі, вырашылі, што гэта — вечаровыя строі. І ў гэтых ядвабных кашулях прыходзілі ў опэрны тэатар.

### На Казюка ішлі шалі

У Вільні заўсёды модна старое, толькі на новы кшталт. Віленскія кабеты любяць шалі — вялікія, камфортныя, элегантныя — і адначасова цёплыя ды тонкія. Яшчэ адное віленскае «заўсёды модна» — пачынаць вясну з кірмашу на Казюка. Дык вось сёлета на Казюковым кірмашы добра йшлі тонкія шалі і вялікія хусткі на плечы. Абавязкова льняныя — натуральнага колеру і пафарбаваныя. Калі трохі пацяплее, прыяжджайце ў Вільню — паглядзець на модніц з ільнянымі шалямі.

### Косы і «Жальгірыс»

Яшчэ ў Вільні, як і ва ўсёй Літве, па-ранейшаму модны патрыятызм. А пасьля выпадку з прэзыдэнтам Паксасам пачалі лічацца моднымі й скандалы. Так, прынамсі, даводзяць сталічныя глянцавыя выданьні. Сакавіцкая фатасэсія папулярнага часопісу стылю і моды «Jeva» так і названая — «Патрыятычныя гульні». Яна расстаўляе акцэнты веснавой жаночае моды. «Нашая моц — не цюльпаны на 8 сакавіка, а знакі нацыянальнай адметнасьці, што хапаюць за сэрца. Свабодная, як Літва. Сэксуальная, як сакавіцкі Акт аб незалежнасьці. Модная, як скандалы. Яскравая, як нацыянальны трыкалёр. Косы і «Жальгірыс» (літаральна — «Грунвальд», легендарная літоўская баскетбольная каманда; летась літоўскія баскетбалісты зноў перамаглі на чэмпіянаце сьвету ў Стакгольме. — **Т.П.**) — атрыбуты нацыянальнае моды. Бяспройгрышна». І, адпаведна, мадэлі: «Літоўская прастасьць» (яна ж і свабода — зусім няшмат вопраткі), «Рэвалюцыя, якая пяе» (косы і парадны вайсковы кашкет), «Прыгажуня-сувязістка» ды інш. Усё можна набыць, цэны прымальныя.

Увесну мастакам-дызайнэрам асабліва хочацца верыць. Але іх прапановы на чарговы сэзон усё ж не заўсёды прымаюцца. Бо віленчукі — не эўрапейскія правінцыялы, якія адно глядзяць на Лёндан і Парыж ды слухаюць сваіх і чужых прафэсіяналаў. Віленчукі не забываюцца ніколі на сваё сталічнае, цэнтральнае становішча ў цэлым вялікім шматнацыянальным рэгіёне, які не абмяжоўваецца адміністрацыйнымі ці дзяржаўнымі межамі. Таму й абіраюць моду на свой густ — самаўпэўнена і непрадказальна. І таму сказаць, што модна гэтай вясной у Вільні, насамрэч можна будзе толькі тады, калі вясна скончыцца, заўважыў мне адзін віленскі моднік. Бо штодзённае жыцьцё, а не дызайнэрскія калекцыі, падрыхтаваныя за паўгоду наперад, стварае моду. І тым болей цяпер — калі і моду, і вясну для свайго места ствараюць самі віленчукі. Самі і разам зь веснавымі гасьцямі Вільні. Альбо — разам зь веснавым ветрам.

**Тацяна Поклад**



**У Вільні заўсёды модна старое, толькі на новы кшталт.**





# Подых тайгі

**У гэтым сэзоне будзе модны сібірскі тып твару і міндалепадобныя вочы. Апроч таго, вяртаюцца клясычныя стандарты. Мода пакідае ў мінулым унісэкс. Як і кожны сэзон. Таму ісьці за модай па-ранейшаму небясьпечна.**

Ужо вызначаны стандарты прыгажосьці на гэты сэзон, сьцьвярджае кіраўнік школы мадэляў і дызайнэр уласнай лініі адзеньня «VM» Уладзімер Манько. Гэта міндалепадобныя вочы, прапарцыйны рот. Актуальныя брунэты і брунэткі. Замест так доўга папулярнай адсутнасьці формаў у дзяўчат вяртаюцца клясычныя «90х60х90». Таксама ў моду ўваходзяць сібірачкі з шырокімі скуламі, вялікімі вачыма і ротам. Расейская мадэль Натальля Вадзянава, што цалкам адпавядае гэтым стандартам, сёньня вельмі папулярная ў сьвеце.

Вядучымі колерамі ў сусьветнай модзе, паводле словаў У.Манька, сёлета будуць беларускія нацыянальныя — чырвоны, белы і чорны. А таксама сотні адценьняў, якія яны даюць.

**Сяргей Трафілаў**

**«J_Морс» трапілі ў струмень гітарнага ракапопсу, дзякуючы эратычнаму — арніталягічнае прозьвішча падманлівае — голасу саліста Ўладзя Пугача.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Настальгія па васьмідзясятых

**Кідкія касьцюмы і прычоскі музыкаў, сцэнічнае шоў, палітычныя й сацыяльныя дэклярацыі ў мікрафон — 80-я вяртаюцца як пратэст супраць безаблічнае клюбнае музыкі. Яны вяртаюцца з сваім вульгарным і сынтэтычным гукам, з радыкальнасьцю, нескладаным рытмам і простай мэлёдыяй.**

46-я цырымонія «Грэмі» расставіла акцэнты не на карысьць року. Большую частку прэмій павезьлі з Лос-Анджэласу рытм-энд-блюзавыя і хіп-хопавыя музыкі. Сапраўднай каралевай балю сталася сьпявачка Бэёнс Ноўлз, што назьбірала ажно пяць залатых грамафонаў. Рэп-дуэт «OutKast» — яшчэ адзін фаварыт-2004. Але мода на гэтыя выключна амэрыканскія кірункі наўрад ці пяройдзе акіян.

У Эўропе свае фаварыты і свае густы. Акром гітарнага ракапопсу (яскравыя прадстаўнікі яго ў Беларусі — «J_Морс»), зьяўляюцца рознага кшталту «гібрыды», напрыклад «гаражны блюз» — як правіла, дзяўчына на бубнах, а хлопец на гітары, бяз басу і іншых дадатковых інструмэнтаў.

Але што яднае Стары і Новы Сьвет, дык гэта ўсіхнае імкненьне да 80-х зь іх вульгарнасьцю і сынтэтычнасьцю гучаньня: нескладаны рытм, простая мэлёдыя, якую можна іграць адным пальцам на сынтэзатары, халодны вакал.

Нешта падобнае гралі калісьці «Pet Shop Boys». Гэты кірунак, які называюць «рамантычнай рэакцыяй на безаблічную клюбную музыку», атрымаў азначэньне «электраклэш». Яго блізкія сваякі — дзядулі дыска-рок і дыскапоп, якія перажываюць сваю «другую маладосьць». Электраклэш можа стацца самым прагрэсіўным кірункам 2004 г., бо ён вяртае ранейшыя прыярытэты: пазыцыя, падыход і погляд на рэчы самога творцы важнейшыя за ўмельства спрадусаваць ды папіярыць. Якраз цяпер гэта можа стацца модным, бо ўсё больш і больш у музычнай індустрыі ўладараць грошы. Так, бюджэт апошняй цырымоніі «Грэмі» склаў 40 млн даляраў, а кіраўніцтва тэлекампаніі, што трансьлявала ўручэньне прызоў, пагражала адлучыць мікрафоны тым артыстам, якія паспрабуюць выступіць зь лёзунгамі супраць вайны ў Іраку.

Настальгія і мода даволі цесна зьвязаны. Таму сёлета модна слухаць дуэт Сайман і Гарфанкел, пэрыяд паўраспаду якога цягнецца з 1970-га. Магчыма, што моднымі стануцца і нашыя героі перабудовачных часоў — «Бонда» і «Мясцовы час». Калі ў арганізатараў акцыі «Генэралы айчыннага року» атрымаецца сабраць іх разам, а потым перавыдаць у нармальнай якасьці іх гіты.

Дзякуючы ўдзелу ў «Эўрабачаньні» дуэту «Аляксандра і Канстанцін» гэтай вясной, краіну можа ахапіць і масавая любоў да «world music». Якраз прыдадуцца новыя альбомы «Троіцы», «Рунаў», «Юр'і», што маюць выйсьці ў красавіку—траўні.

**Сяргей Будкін**




## Пратэстанцкая «Спадчына»

Пабачыў сьвет сьвежы нумар «Спадчыны» — №1 за 2003 г. На гэты раз тэмай нумару абранае пратэстанцтва. Самая нечаканая пастаноўка праблемы — у артыкуле Ігара Марзалюка «Праваслаўная Рэфармацыя». Пратэстанцкая этыка, дух капіталізму — ці ёсьць гэта праявы толькі заходняй цывілізацыі? Марзалюк распавядае пра страчаны шанец праваслаўя стаць калыскай капіталізму. Пра станіцу пратэстантызму ў ВКЛ — Радзівілаўскі Слуцак — распавядае Станіслаў Акінчыц у артыкуле «Горад, дзе захавалася традыцыя». Удзел пратэстантаў у нацыянальным Адраджэньні мяжы XIX—XX ст. дасьледуе Алег Латышонак у матэрыяле «Беларускія палітыкі і пратэстанты». Ад «Гомона» да Грамады». Тамара Габрусь, Алег Трусаў, Мікола Пачкаеў, Сяргей Кавалёў — гэта толькі частка навукоўцаў, якія прапануюць свае дасьледаваньні беларускага пратэстантызму.

Тэму нумару «Спадчына» спалучае з матэрыяламі іншае скіраванасьці. Ірына Раманава ў артыкуле «Голад 1932—1934 гадоў і БССР» адкрывае малавядомую старонку беларускай гісторыі — зьяву, вядомую ва Ўкраіне пад назвай «галадамор».

# Тату на ўсё жыцьцё

**Самыя папулярныя месцы на целе для татуіроўкі ў дзяўчат — талія, хвасьцец, а у хлапцоў — плячо, лапатка, паясьніца. Прыйшлі муж і жонка ды папрасілі вытатуяваць ім словы «Беларусь назаўсёды!»**

Самы апошні шык у сьвеце татуіровак — зрабіць надпіс на сьлізістай абалонцы ніжняй губы ў роце. Там звычайна выколваюць уласнае імя (раптам забудзешся?) ці дату нараджэньня. Аднак на такія ахвяры дзеля прыгажосьці багата ў каго пакуль не стае мужнасьці. Затое пашыраецца мода на тату з нацыянальнай сымболікай і патрыятычнымі лёзунгамі.

Пасьля таго як тату трапіла ў сусьветны каталёг моды, нацельны малюнак стаў зьявай маскультуры. Татуіроўка выйшла з андэрграўнду. Першыя машыны й брудныя іголкі майстры прыгадваюць з жахам. Цяпер тату — бізнэс: на прыстойнай тэхніцы і з анэстэзіяй ужо за 30 у.а. можна прыдбаць малюнак памерам з пушку ад запалак.

Кожны сэзон прыносіць свае навінкі. Модныя летась японскія гіерогліфы сёлета выцiснутыя грэцкім ды эгіпэцкім пісьмом. Грэцкія арнамэнты заўжды правільнай формы, з простымі кутамі. У такіх узорах часьцей сустракаецца чорны колер. Не саступаюць сваіх пазыцыяў славянская і кельцкая тэматыкі зь іх мноствам закручаных лініяў. Па-ранейшаму папулярнае й Сярэднявечча: бывае, кліенты самі прыносяць узоры, знаходзячы іх у старадаўніх хроніках і дакумэнтах. Папулярныя й вывы прыродных аб'ектаў: у мужчынаў гэта тыгры, гепарды, а ў жанчынаў застаюцца нязьменнымі кветкі, дэльфіны, матылі.

Апошнім часам у тату-салёнах усё часьцей замаўляюць нацыянальную сымболіку, аднак якасна выканаць яе зможа ня кожны майстар. А раз прыйшлі муж і жонка ды папрасілі вытатуяваць ім словы «Беларусь назаўсёды!». Бывалі й такія арыгіналы, якія замаўлялі партрэт Аляксандра Лукашэнкі на грудзёх.

Тату мае пэўную сымболіку. Калі чалавек просіць вытатуяваць яму чорта, гэта сьведчыць пра няўрымсьлівы характар, мужчынскасьць. Амазонка, дзяўчына на кані — моцная жанчына. Вывы Пэгаса замаўляюць усё радзей.

«Пасьля выхаду новых фільмаў, дзе фігуруюць героі з татуіроўкамі ці ёсьць фірмовы лягатып, адразу зьвяртаюцца да нас. Людзі жадаюць мець гэткі ж малюнак на сабе. Майстрам доўга даводзіцца пераконваць, што мільёны будуць хадзіць з такой татуіроўкай. Забываюцца, што яна на ўсё жыцьцё», — кажа Ала, майстрыха аднаго зь менскіх тату-салёнаў. Гэтаксама пераймаюцца малюнкі зь целаў музычных зорак.

Каля 75% кліентаў жадаюць разьвітацца з старымі татуіроўкамі. Але ж не заўжды гэта магчыма. Тады і ўзьнікаюць малюнкі кшталту чорных крумкачоў ды масак. Праўда, бываюць і такія выпадкі, калі чалавек жадае вярнуцца ў мінулае. Аднойчы мужчыну гадоў сарака нанесілі армейскую татуіроўку, прычым замоўца строга кантраляваў вытрымліваньне ўсіх яе канонаў. Калі ж казаць пра нанясеньне новых малюнкаў, дык тут больш ахвотных сярод жанчынаў, кажуць майстры. Яны большыя рызыканткі.

Самыя папулярныя месцы на целе для татуіроўкі ў дзяўчат — талія, хвасьцец, а у хлапцоў — плячо, лапатка, паясьніца. Каб ня ўбачылі бацькі, малюнак часам наносяць на нагу.

Па месцы татуіроўкі лёгка вызначаецца і сацыяльная пазыцыя чалавека. На бачных месцах набіваюць малюнак людзі творчыя, бамонд, працаўнікі камэрцыйных структураў. Дзяржслужбоўцы прыхоўваюць тату пад адзеньне. Аднак бываюць выпадкі, калі нават людзі «з органаў» замаўлялі сабе вялікія малюнкі. Моладзь робіць папулярныя татуіроўкі малога памеру. Буйныя бізнэсоўцы і крымінальнікі наагул рэдкія госьці салёнаў.

Век наведнікаў там — 18—32 гады. Бо старэйшыя лічаць: з татуіроўкай — значыць, зэк.

**Сяргей Трафілаў**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Васіль Кавальчук, саліст Беларускай опэры, найбольш адпавядае заходняму ідэалу.**

# Тоўстыя галасы ня ў модзе

**Опэру часьцяком называюць мастацтвам музэйным, застылым і пазачасавым. Калі б тыя, хто прапагандуе гэткі погляд, ведалі, наколькі опэра зьменлівая ў сваім імкненьні пасьпець за легкадумнаю модаю! Дый як жа іначай яна б утрымала ўвагу сваіх галоўных спажыўцоў — заможных і адукаваных «заканадаўцаў моды», гатовых плаціць 200—300 даляраў за квіток у партэр? Цягам апошніх дваццаці гадоў опэра на Захадзе канчаткова ператварылася ў «індустрыю мараў», якая задавальняе патрэбы людзей з тоўстым кашальком і багатай фантазіяй. Дзеля гэтых людзей існуюць фэстывалі, на якія штогод зьяжджаюцца «вяршкі». Квіткі на наступны год тут рэзэрвуюць адразу па заканчэньні фэсту і выкладваюць за іх горы грошай. Стыль пастановак — экстравагантны да крайнасьці, але сам характар гэтай экстравагантнасьці вельмі зьменлівы.**

## Моцарт ад куцюр

Прыкладам, дзесяць гадоў таму ў Моцартавым Зальцбургу панаваў авангард. Тагачасны інтэндант Зальцбурскага фэстывалю Жэрар Марцьё замаўляў опэры самым славутым эўрапейскім кампазытарам — італьянцу Лучана Бэрыё, немцу Гансу Вэрнэру Генцэ, фіну Кая Саарыяха. Цікава, што ўсе яны ў свой час былі заядлымі камуністамі, а Генцэ нават аддаў даніну «старшыню» Мао. Музыка, якую яны пісалі, складалася скрозь з рэчытатываў і дысанансаў. Публіка нудзілася, але трывала ўсе зьдзекі, у тым ліку й авангардныя рэжысэрскія экспэрымэнты, бо модна!

Цяпер авангардных опэраў у Зальцбургу паменела, затое пышна расквітнеў пастановачны постмадэрнізм. Пазалетась у якасьці «галоўнай стравы» прэзэнтаваўся моцартаўскі «Дон Жуан», пастаўлены ў тыповай вітрыннай эстэтыцы: боды-арт, масоўкі ў бялізьне «ад куцюр», самнамбулічнае блуканьне дзіўных манэкенных сылюэтаў. Зьмяніўся нават сюжэт: Камандора забіваў ня сам Дон Жуан, а ягоны слуга Лепарэла.

Летась галоўнай сэнсацыяй стаў ізноў Моцарт. Да яго 250-е гадавіны, якую будуць сьвяткаваць у 2006 г., у Зальцбургу плянуюць паставіць усе ягоныя опэры, улучна з «Асканіяй у Альбе», не ўзнаўлянай 220 гадоў. Узнаўленьне розных дзівосных згубаў — адна зь яскравых тэндэнцыяў у сучасным мастацтве. Але пакуль да «Альбы» чарга не дайшла. Опэраманы мусілі задаволіцца папулярным у Эўропе «Выкраданьнем з гарэму». На прэм’еры прысутнічалі прынц Чарльз з Камілай Паркер Боўлз. І што ж яны ўбачылі? Галоўных герояў у касьцюмах Адама і Евы; замест турэцкай раскошы — інтэр’ер эўрапейскай бюргерскай кватэры; гарэмны вартаўнік Селім ператварыўся ў каталіцкага патэра. Цягам цэлага спэктаклю каханкі рыхтаваліся да вясельля і абстаўлялі сямейнае гняздо: клеілі шпалеры, перасоўвалі мэблю, куплялі побытавую тэхніку.

## Фундатары пратэстуюць

Такія вось цяперака опэрныя моды на радзіме Моцарта. І яны далёка ня ўсім даспадобы. Летась зь ліку спонсараў Зальцбурскага фэстывалю выйшаў Альбэрта Віляр — амэрыканскі банкір кубінскага паходжаньня, які цягам сваёй кар’еры выдаў на патрэбы опэрнага мастацтва 100 млн даляраў. За часамі Жэрара Марцьё ён штогод ахвяраваў Зальцбурскаму фэстывалю мільён даляраў, але спыніў выплаты праз нязгоду з эстэтычнымі поглядамі новага кіраўніцтва.

Тое самае адбылося і ў нью-ёрскай «Мэтраполітэн Опэра», дзе Віляр «замаўляў музыку» цэлае дзесяцігодзьдзе. Менавіта на ягоны загад на нью-ёрскай сцэне ставіліся малавядомыя опэры Пракоф’ева. Тым часам іншыя спонсары абураліся, і кіраўніцтва «Мэт» мела клопат з улагоджваньнем гэткіх канфліктаў.

Прыкладам, нейкая кабета, паміраючы, адпісала «Мэтраполітэн» 42 млн даляраў «на пастаноўку опэраў клясычнага рэпэртуару». Праз пяць гадоў яе душапрыказчыкі ўсчалі супраць «Мэт» судовую справу, сьцьвярджаючы, што частка грошай пайшла «на іншыя мэты» — то бок на пастаноўку «Трышчана ды Іжоты» Рыхарда Вагнэра. А фундатарка не лічыла творчасьць Вагнэра «клясычным рэпэртуарам». Суд узяў бок прыказчыкаў душы, і цяпер у рэпэртуары «Мэт» ізноў пераважаюць опэры Вэрдзі і Пучыні. Зрэшты, спэктакляў там ставяць многа, застаецца месца і для Бэрліёза, і для авангарднае опэры пра Галакост.

## У модзе Галівуд

Новыя тэндэнцыі нарадзілі новы вобраз «моднага сьпевака». Адышлі ў мінуўшчыну «тоўстыя» галасы з баранчыкам, парадыйнакакетлівыя каляратурныя сапрана, прыдатныя для венскіх вальсаў, і салодкія тэнары, пазбаўленыя мужнасьці. Цяпер калі тэнар — дык абавязкова гераічны. Альбо акрабатычна гнуткі, прыдатны для сьпяваньня музыкі барока. (Зрэшты, наш час багаты не на тэнараў, а хутчэй на басоў і барытонаў.) Тое ж датычыць іншых тыпаў галасоў.

Асноўнае патрабаваньне да ўсіх — «аўдыёгенічнасьць». Голас мусіць быць роўны, без дэфэктаў ці вакальных хібаў, якія даўней парадаксальным чынам рабілі сьпевака «індывідуальнасьцю». Яшчэ галасы сапраўдных «зорак» абавязкова адрозьніваюцца нейкімі надзвычайнымі вартасьцямі: яскравым тэмбрам, шырокім дыяпазонам, прыдатнасьцю для музыкі розных эпохаў і стыляў ці акрабатычнымі здольнасьцямі. Галасы выразныя, але безь сьлязы; гнуткія, зьменлівыя, здольныя праз інтанацыю выказаць любое пачуцьцё.

Бо сёньняшні опэрны сьпявак — гэта ня толькі вакаліст, але абавязкова актор. Амэрыканскія сьпевакі, апрача кансэрваторыі, вучацца ў найлепшых тэатральных студыях. Славуты тэнар Ніл Шыкаў сваёй манерай акторскае гульні нагадвае Дастына Хофмана; і ў гэтым няма нічога дзіўнага, бо абодва асвойвалі сыстэму Станіслаўскага ў акторскай школе Лі Страсбэрга.

«Модныя» сьпевакі й выглядаюць як галівудзкія зоркі — асабліва кабеты. Першыя прыгажуні — прымадонны «Мэт» Рэнэ Флемінг і «Ковэнт Гардэну» Анхела Геаргію. Надзвычай папулярная мэцца-сапрана Чэчылія Барталі таксама вельмі прывабная, хоць і не ўкладаецца ў стандарты 90-60-90.

Калі б Мансэрат Кабалье пачынала сёньня сваю кар’еру, у яе не было б аніякіх шанцаў. Асабліва ў параўнаньні з звонкагалосымі і грацыёзнымі дзяўчынкамі з Кітаю і Паўднёвай Карэі, якія заваёўваюць сэрцы заходняе публікі. Сярод «модных» сьпевакоў таксама шмат афраамэрыканцаў.

А вось беларусаў няма — калі не лічыць Марыі Гулегінай, якая пачынала творчы шлях на беларускай сцэне. І вінаватыя ў гэтым старыя стандарты, паводле якіх вучаць у Акадэміі музыкі, адсутнасьць добрай акторскай падрыхтоўкі, неахайны вакал. Шчасьлівыя выключэньні — Ніна Шарубіна, Уладзімер Пятроў і Васіль Кавальчук, якія зь сёньняшніх салістаў Опэры найбліжэй падыходзяць да заходняга ідэалу. Дзіва — Шарубіна й Кавальчук зь цяжкасьцямі пракладалі сабе шлях на беларускую сцэну.

Аднак ёсьць яшчэ маладыя. Тыя, хто толькі распачынае кар’еру ў мастацтве і мае дастатковы патэнцыял, каб ператварыць Опэру ў «модны тэатар» эўрапейскае клясы. І тыя, хто захоча выдаткаваць грошы на стварэньне спэктакляў і выхаваньне новых опэрных зорак. Але гэта здарыцца толькі тады, калі мы далучымся да астатняе Эўропы і зажывём паэўрапейску. Бо ў бедных краінах бываюць толькі бедныя тэатры.

**Юлія Андрэева**

**Модная літаратура існавала ва ўсе часы. Некаторых, праўда, тыя «моды» страшэнна раздражнялі, як Мігеля Сэрвантэса. Аднак, пазбавіўшы жанр рыцарскага раману статусу моднай літаратуры, ён стварыў новую літаратурную моду. Хутка пра прыгоды Дон Кіхота прагна чыталі ў Эўропе і ў калёніях, забыўшыся на Амадыса Гальскага.**



АРЦЁМ ЛЯВА

# Проста раманы

## Якая літаратура папулярная ў Расеі

Заўважым, што Сэрвантэс пад маскай забаўляльнага чытва прапанаваў чытачам «высокую» літаратуру. Сучасная модная заходняя проза моцна розьніцца ад барочных раманаў Сэрвантэса са шматлікімі мініятурамі-ўстаўкамі, філязофскімі развагамі і сэнтэнцыямі. Паводле слоў Алы Штэйнман, дырэктаркі маскоўскага выдавецтва «Фантом-Прэс», якая адкрыла расейскаму чытачу імя Яаны Хмялеўскай, гэта найперш сюжэтная проза без мудрагельства: «Там даўно забыліся на постмадэрнізм, фэмінізм, фрайдызм. Яны гавораць сучаснай мовай пра сучаснага чалавека».

Зусім ня факт, што з дапамогай маркетынгавых тэхналёгіяў можна зрабіць модным пісьменьнікам каго хочаш і калі хочаш. У будучага куміра павінен быць патэнцыял, да таго ж чытацкая аўдыторыя здольная самастойна камандаваць рынкавым парадам. Прыкладам можа быць сытуацыя з бразыльцам **Паўла Каэльё** — ягонага «Альхіміка», які выйшаў у расейскім выдавецтве «Вагрыус» у 1995 г. і абяцаў значныя зьмены ў першай дзясятцы моднай літаратуры, тады ніхто не заўважыў. Альбо са спадарыняй **Варанцовай**, літаратурным клонам дэтэктывўшчыцы **Дар'і Данцовай**, якую чытачы сьвядома і цалкам ігнаруюць.



**Бразылец Паўла Каэльё не прыйшоўся даспадобы расейскаму чытачу ў 1995 годзе.**

### Лёгкім стылем пра разумныя рэчы

Мода ў літаратуры фармуецца ня толькі выдаўцамі-цынікамі, якія імкнуцца збагрыць пад відам Літаратуры чарговую партыю мас-макулятуры, ня толькі верхнім зрэзам спажыўцоў — аматараў «жаночых» дэтэктываў і немудрагелістых філязофскіх прыпавесьцяў. Значную ролю ў фармаваньні расейскае кніжнае моды адыгрываюць і сур'ёзныя выдавецтвы («Симпозиум», «Иностранная литература»), эстэтычны густ якіх падзяляюць літаглядальнікі аўтарытэтных «Известий» ці «Огонька».

Сёньня мяжа дзьвюх літаратур — элітарнай («высокай») і бульварнай («нізкай») — аказалася размытай. Так, у Японіі найбольш прэстыжнымі літаратурнымі прэміямі зьяўляюцца прэмія **Акутагавы** і прэмія **Наокі**. Абедзьве заснаваныя ў 1935 г. адным выдавецтвам. Першая прысуджаецца за творы «высокай» літаратуры, другая — «нізкай». Але ў апошнія дзесяцігодзьдзі розьніца паміж гэтымі прэміямі стала зусім няяснай. Нярэдка аўтар, які, паводле перакананьня грамадзкасьці, належыць да прадстаўнікоў «высокай» літаратуры, атрымлівае прэмію Наокі, і наадварот. Раней у Японіі пашырыўся быў нават спэцыяльны тэрмін — «цюкан сёсэцу» («прамежкавая літаратура»). Але цяпер і ён састарэў. Японскія літаратуразнаўцы кажуць, што ў XXI ст. чытач наагул страціць здольнасьць разьмяжоўваць літаратуру на «высокую» і «нізкую» і будзе «чытаць проста раманы».


SERWISY.GAZETA.PL

**Тадэвуш Канвіцкі, аўтар аповесьці «Чытво»**

І сучасная літаратура Расеі рухаецца да руйнаваньня літгіерархіі, стварэньня якаснай «разумнай» літаратуры, напісанай займальна, лёгкім стылем. Самыя вызначальныя аўтары тут — **Віктар Пялевін** і **Барыс Акунін**. Раман «Азазэль» Акуніна нават стаў намінантам на адну з самых прэстыжных літаратурных прэміяў сьвету — брытанскай «The Macallan Daggers».

### Баўдаліна ў фаворы

Сярод эўрапейскіх літаратараў-інтэлектуалаў, модных сёньня ў Расеі, найперш варта назваць **Умбэрта Эка**. Яго апошняму, чацьвертаму раману «Баўдаліна» было папросту наканавана стаць бэстсэлерам. Мяркуйце самі: звонку — вострасюжэтны гістарычны раман з элемэнтамі дэтэктыву й трылернай падвойнай разьвязкай. А ўсярэдзіне — аповед аб мэханізмах ствараньня і спосабах існаваньня інфармацыі, а таксама аб тым, як інфармацыя фармуе рэчаіснасьць. Баўдаліна — прыёмны сын імпэратара Фрыдрыха Барбаросы, нястомны апавядальнік ды ілгун-мітатворца, які выпраўляе эўрапейскае рыцарства ў крыжовыя паходы, кананізуе Карла Вялікага, фальсыфікуе палову кніжнай спадчыны Захаду. «Гісторыя паўстае тут як прадукт здаровай і запатрабаванай выдумкі. Сьвет прыстасаваўся да фантазіяў Баўдаліна», — кажа сам Эка.

Дэтэктыўная завязка з трупам прысутнічае ў аповесьці «Чытво» **Тадэвуша Канвіцкага**, якога называюць «польскім нацыянальным скарбам». Але ўжо на 11-й старонцы твору адбываецца дзівосная трансфармацыя жанру. Чытаем праніклівую лірычную трагікамэдыю.


WWW.CNN.COM

**Японец Кадзуа Ісігура з шасьці гадоў жыве ў Вялікай Брытаніі. Ужо першы ягоны раман, які аўтар напісаў у 28 гадоў, быў адзначаны Каралеўскім літаратурным таварыствам.**

Аніякіх забойстваў нямашака ў рамане чэха **Міхала Вівэга** «Найлепшыя гады — сабаку пад хвост». 60-я гады. Чэхія. Звычайная сям'я, жыцьцё якой расьпісана аўтарам да драбніцаў. І паралельна з гэтым — іранічны аповед пра стасункі літаратара і выдаўца. Выдатная «сямейная хроніка» і ўзор гумарыстычнай інтэлектуальнай прозы. Шчасьлівы шлюб «высокай» і «нізкай» літаратуры. Уяўленьне пра стыль **Вівэга**, гучаньне ягонай прозы наш чытач можа атрымаць, прачытаўшы «Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі». Гэты раман друкаваўся летась у часопісе «Arche» (№ 4—5). У тым самым часопісе надрукаваны і хрэстаматыйны раман **Канвіцкага** «Малы апакаліпсіс».


1.IM.CZ

**Уяўленьне пра стыль Вівэга наш чытач можа атрымаць, прачытаўшы «Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі». Гэты раман друкаваўся летась у часопісе «Arche».**

Як і ў выпадку зь Вівэгам, раман ірляндца **Шэймаса Дына** «Чытаньне ў цемры» шмат у чым аўтабіяграфічны. Трагедыя, якая адбылася ў першай палове XX ст. у жыцьці ірляндзкай сям'і, блізкай да ІРА, змрочным ценем падае на наступныя пакаленьні іхнага роду. Каб адчуць атмасфэру раману, дадайце сюды ірляндзкі фальклёр, умела скарыстаны Дынам, усіх гэтых нядобрых эльфаў і фэяў, якія лунаюць поруч з галоўнымі пэрсанажамі.


WWW.VINTERFESTUKA.NO

**Культавы нарвэскі пісьменьнік і крытык Эрленд Лу.**

Культавы нарвэскі пісьменьнік і крытык **Эрленд Лу** ў рамане «Наіўна. Супэр» апавядае ад імя маладога чалавека. Адчуўшы пякучую бессэнсоўнасьць уласнага існаваньня, ён выпадкова натрапляе на… падручнік фізыкі і пачынае наноў адкрываць жыцьцё. Чуйна і арыгінальна зірнуў на звычайны сьвет гэты пісьменьнік, які к сваім 32 гадам пасьпеў зьняць колькі кароткамэтражных фільмаў і музычных відэакліпаў, папрацаваць, як Цётка, у тэатры, псыхіятрычнай бальніцы, школе, газэце. Пасьля гэтай кнігі я, натхніўшыся прыкладам галоўнага героя, прапанаваў сваім знаёмым скласьці сьпіс жывых істот, якіх яны бачылі на свае вочы — за выняткам ТБ і заапарку. І стала адразу і сьмешна, і сумна.

Японец **Кадзуа Ісігура** з шасьці гадоў жыве ў Вялікай Брытаніі. Ужо першы ягоны раман, які аўтар напісаў у 28 гадоў, быў адзначаны Каралеўскім літаратурным таварыствам. «Несуцешныя» — найбольш складаны раман Ісігуры, проза высокага гатунку з шматлікімі літаратурнымі й музычнымі алюзіямі. Аўтар «зрабіў кафкіянскія дэкарацыі фонам для адлюстраваньня асобы мастака, няздольнага падзяліць сваё прыватнае і сацыяльнае жыцьцё», — адзначаецца ў прадмове выдавецтва «Симпозиум».

Перакладаюць у Расеі й паўднёваславянскую літаратуру. Асабліва папулярныя раман-трылёгія македонца **Слаўка Янеўскага** «Міраклі», а таксама раманы сэрба **Гарана Петравіча** «Атляс, складзены небам» і «Аблога царквы Сьвятога Спаса»... Усе гэтыя кніжкі можна знайсьці й на менскіх развалах.

**Павал Абрамовіч**


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Павал Абрамовіч — літаратурны крытык, выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту

# Будучы паводле нараджэньня беларусам




КАЛЯЖ АНДРЭЯ ЧЫКА

Генэрал Булак-Балаховіч не марудзіў з адказам. У рэвэльскі гатэль «Залаты Леў» да Кастуся Езавітава прыйшлі трое афіцэраў і паведамілі, што генэрал беларускую мову ведае, а Беларускую Народную Рэспубліку гатовы бараніць усімі сваімі сіламі.

Рыга, люты 1920. Шэф Вайскова-дыпляматычнай місіі БНР у Рызе Кастусь Езавітаў узяў чарговую заяву. Напісаная яна была па-француску — такое здаралася ня кожны дзень. Да паперыны быў далучаны пераклад, старанна падрыхтаваны справаводам місіі Станевічам.

Заяваў на атрыманьне беларускага пашпарту з кожным тыднем было ўсё меней — за некалькі месяцаў працы місіі ўсе рэсурсы незарэгістраванага беларускага насельніцтва ў Латвіі амаль дарэшты вычарпаліся. Консульскія прыбыткі спыніліся. Місія адчайна змагалася за фізычнае існаваньне. Чарговы просьбіт пісаў: «Шаноўнае спадарства, будучы паводле нараджэньня беларусам, хоць і англічанінам паводле паходжаньня, і даведаўшыся, што я магу быць карысным нашай Рэспубліцы, маю гонар запрапанаваць свае паслугі ўраду Беларусі.

Нарадзіўшыся ў 1897 годзе ў Віцебскай губэрні ад бацькоў-англічанаў, я выхоўваўся ў Петраградзе ў гімназіі Сьвятога Пятра. Я займаў розныя пасады ў якасьці карэспандэнта замежных моваў, найбольш важных у сучасным гандлі. Я выдатна ведаю мовы: ангельскую, расейскую, француску, нямецкую і гішпанскую — гутарку і пісьмо. У цяперашнім часе я знаходжуся на ўрадавай службе ў Ніжняй Курляндыі ў Лібаве ў якасьці карэспандэнта замежных моваў і ў тым самым часе рэдактарам ангельскага часапісу гэтага горада…»

Адкуль у Лібаве ў такую пару мог узяцца ангельскі часапіс, задумаўся Езавітаў. Але горад партовы, мала якія там могуць быць дзівосы. Ну, што там далей…

«…Я выдатна бачу, што ўсе або амаль усе шанцы Беларускай Рэспублікі на посьпех залежаць ад паводзінаў Саюзьнікаў у дачыненьні да маладой і моцна ўціснанай інтрыгамі яе суседкі Польшчы Рэспублікі. З гэтай прычыны варта было б закласьці пачаткі прапаганды ў дзяржавах Антанты: Англіі і Злучаных Штатах больш, чым у Францыі, бо апошняя апякуецца Польшчай ад дня заснаваньня і будзе апекавацца ёю ў далейшым.

Вось чаму я лічу сваім абавязкам зьвярнуцца да Вас, Шаноўнае Спадарства, як да прадстаўнікоў Беларусі, прапануючы свае веды і працу нашаму Ўраду, і разам з тым горача веру, што Беларуская Народная Рэспубліка стане Вялікай і Вольнай краінай. Зрабеце ласку, зьвярнецеся да Ўраду і як мага хутчэй паведамце пра яго рашэньне.

Прымеце ўпэўненьні ў маёй найглыбейшай пашане.

Гедвард Брас.

Лібава, 2 лютага 1920 году».

Падобныя лісты місія атрымлівала як найменей раз на тыдзень. Цяжка сказаць — што прыцягвала замежнікаў, чым іх так вабіла загадкавая і невядомая на той час Беларусь, якая нібыта не абяцала ні багацьця, ні шчасьця, ні долі. Шэф місіі звычайна задавольваў гэткія просьбы, адчуваючы апостальскі запал у пашырэньні беларускай веры сярод чужынцаў. Зь беларускім пашпартам у Латвіі жылі ўжо ня толькі звычайныя румыны, караімы і татары, але і грэкі, хазары і нават адзін невядома адкуль занесены скіф. Быў, што праўда, у валоданьні пашпартам і практычны аспэкт — зь ім цалкам легальна можна было езьдзіць праз неспакойныя паваенныя межы.

Наклаўшы станоўчую рэзалюцыю на заяву новага патрыёта беларускай справы, Езавітаў прыгадаў самую буйную здабычу, якая за гэтыя некалькі месяцаў трапіла ў ягоны рэгістрацыйна-консульскі нерат…

Падчас падарожжа ў справах місіі ў Эстонію і Фінляндыю, дзе Езавітаў шукаў раскіданых вайною па сьвеце беларусаў з мэтай іх рэгістрацыі і патэнцыйнай мабілізацыі ў беларускае войска, ён сярод іншага сустрэўся з прадстаўнікамі генэрала Балаховіча. Пра Станіслава Булак-Балаховіча на той час было вядома толькі тое, што ён пасьпеў паваяваць і на баку чырвоных, і на баку белых і быў гатовы пусьціцца са сваім Асобным Атрадам у любыя прыгоды.

30 кастрычніка 1919-га Езавітаў меў гутарку з прадстаўніком Балаховіча падпалкоўнікам Мінгрэльскім і даведаўся, што генэрал цяпер — зусім вольны чалавек. Юдзенічу не падпарадкоўваецца, працуе разам з эстонцамі, але не пад іх кіраваньнем. За баявую дапамогу часам атрымлівае ад іх грошы і прадукты. Хацеў бы быць бліжэй да роднай Вільні. Некалі лічыў сябе ліцьвінам, але цяпер даведаўся пра беларусаў і ўжо сам ня ведае, хто ён. Хацеў бы лепей пазнаёміцца зь беларускай картай, рухам і гісторыяй.

Дасьведчаны прапагандыст Езавітаў умомант пабачыў, што здабыць для Беларусі гэтую заблукалую душу будзе няцяжка, і паслаў Балаховічу просьценькі тэст, які складаўся зь пяці пытаньняў:

1. Ці ведае ён беларускую мову?
2. Ці ведае мову літоўскую?
3. Ці ведае, што прозьвішча ў яго зусім беларускае, бо па-літоўску было б «Балаховічунас»? (Тут быў наўмысны перабор — хацелася для большага эфэкту, каб гучала як найстрашней.)
4. Як ён ставіцца да нацыянальных пытаньняў?
5. Ці прызнае ён незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі?

Балаховіч ня стаў марудзіць з адказам. 4 лістапада да Езавітава ў рэвэльскі гатэль «Залаты Леў» прыйшлі трое афіцэраў атраднага штабу і паведамілі, што генэрал беларускую мову ведае, а Беларускую Народную Рэспубліку гатовы бараніць усімі сваімі сіламі. Адчуўшы ўсю памылковасьць і недарэчнасьць сваёй колішняй ліцьвінскай арыентацыі, Балаховіч вярнуўся ва ўлоньне ад веку роднай яму беларушчыны.

Вынікам гэтага этнічнага прасьвятленьня стаўся зварот генэрала да Ўраду БНР:

«Старшыні Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі праз Шэфа Вайскова-Дыпляматычнай Місіі ў Латвіі і Эстоніі палкоўніка Езавітава.

Зьяўляючыся грамадзянінам Беларускай Народнай Рэспублікі, лічу патрэбным, каб маё войска было скарыстанае для абароны цэласьці і непадзельнасьці маёй Бацькаўшчыны, а таму прапаную майму Ўраду залічыць мяне і мой атрад на Беларускую Службу.

Генэрал-маёр Булак-Балаховіч».

Глыбока крануты і ўсьцешаны заявай генэрала, Кастусь Езавітаў пераслаў яе ў Варшаву старшыні Ўраду БНР Антону Луцкевічу, выказаўшы ўпэўненасьць, што просьба Балаховіча будзе задаволеная. І яна была задаволеная. Аднак сам генэрал зь ягоным атрадам прапаў зь беларускіх далягляду амаль на год, а пасьля зусім нечакана ўсплыў увосень 1920-га і ўзьняў на Палесьсі антыбальшавіцкае паўстаньне, адмяніўшы ўсе іншыя тагачасныя беларускія ўлады ды ўрады і абвясьціўшы сябе Бацькам Беларускага Народу.

Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі каштавала нямала палітычных намаганьняў, каб давесьці сьвету, што ён ня меў ніякага дачыненьня да акцыі Балаховіча, якая адзначылася пагромамі, бандытызмам і авантурным палітыкаваньнем. Аднак усё гэта будзе пазьней, і тады Езавітаву яшчэ прыпомняць ягоную паслугу ў прыцягненьні да беларускай службы падазроных генэральскіх кадраў. А цяпер перад шэфам місіі ляжала наступная заява:

«Пану Маршалку Беларускага Ўраду

Яго Сьветласьць Князь Станіслаў-Павел-Леў Сапега з прыдомкам Ваявода, скарочана Вой, мае гонар зьвярнуцца да Вас, азнаймуючы, што Род Сапегаў, зь якога паходзіць князь, — беларускі з крыві і косьці. Князь народжаны ў замку пры капальнях сталёвай руды Варшава каля Чыкага ў Амэрыцы 11 сакавіка 1887 году і ахрышчаны ў капліцы Гуты Варшава ў Сьвятой Беларускай Грэка-Каталіцкай веры.

Князь — беларус, што азначае ня толькі бязьмежнае заміласваньне да беларускага народу, але спалучае ў сабе любоў, вольнасьць і справядлівасьць. Ён успрымае справу Беларусі як Краіны і толькі ў саюзе і пад апекай нямецкай імпэрыі і з агідай адхіліў бы любую спробу пабудовы Беларусі ў саюзе са злом, у зьвязе з гвалтам і ў хаўрусе з чыёй бы там ні было няволяй…»

Літары неахайна друкаванага тэксту заскакалі ўвачку. На сёньня хопіць, сказаў сабе Езавітаў і адклаў ліст убок…

**Сяргей Шупа, радыё «Свабода»**




АРЦЁМ ЛЯВА

**У віленскіх супэрмаркетах, сярод сэзонных гаспадарчых дробязяў, прадаюцца дыхтоўныя шпакоўні з ацынкаванымі стрэшкамі. Каштуюць 19.90 літаў (каля сямі даляраў). Такі вось падарунак для занятых аматараў птушак — хто ня мае часу рабіць дамкі сваімі рукамі.**

# Подзьвіг невядомае курыцы

Раней пра Беларусь у кнізе рэкордаў Гінэса можна было дазнацца праз самую вялікую тэхнагенную катастрофу — Чарнобыль, самае вялікае разавае пахаваньне ахвяраў палітычных рэпрэсіяў — Курапаты, самае вялікае балота ў Эўропе — Вялікі Мох, самы вялікі Кішчанкаў габэлен і самую вялікую ў сьвеце піраміду з костак даміно. Набор спэцыфічны.

Але новы наш рэкорд здольны зьмяніць імідж краіны. У Беларусі куры могуць несьці «нечалавечых» памераў яйкі! Невядомая чубатка з Чырвонаармейскае птушкафабрыкі, што ў Міры, зьнесла яйка ажно на 160 грамаў (норма — 50—60). Гэта на добрыя 12 г болей за папярэдні рэкорд кнігі Гінэса, зафіксаваны... на Кубе. Такая вось палітычная паталёгія. Бачных экалягічных паталёгіяў мірскае яйка ня мае. Хіба што фізіялягічную — у тым яйку ёсьць яшчэ адно яйка. Як у расейскай лялькі «Матрунцы».

Прыкра, што тая кура засталася ананімнаю. Цяжка яе знайсьці сярод 20 тысячаў таварышак. Толькі й вядома, што ўзрост: 350 дзён. Росквіт курынага веку.

# Апэрацыя «Ы»

## фэльетон

Нават падлеткі, якія трасуць у суседа яблыкі, ставяць некага на шухер. Калі чэкісты, ідучы чысьціць апазыцыйныя офісы, ня ведаюць нават такіх аксіёмаў зладзейскай прафэсіі, ня дзіва, што іх ловяць, як тых фраераў.

Цікава, як бы пракамэнтаваў Жалезны Фэлікс — натуральна, калі б быў жывы — навіны з Горадні, дзе гэбэшнікі (гэтак сьцьвярджае сайт «Пагоні») спрабавалі «падняць» офіс газэты «День»? А Лемянтоўскі, Мальчык і яшчэ пару «франтавікоў» іх павязалі і здалі ў мянтоўку? Баюся, слабое высакароднае сэрца Эдмундавіча ня вытрымала б такога мэсыджу. «Піжоны, якія піжоны», — сказаў бы крэатар «чырвонага тэрору» і, здаўшы пост Мянжынскаму, зьехаў бы ў родныя Ашмяны прадаваць літоўскім турыстам танную самагонку.

Відавочна, падрыхтоўка налёту на «День» нагадвала вядомы дыялёг Панікоўскага і Балаганава: «Толькі крадзеж, таварыш лейтэнант Шура». — «Не, таварыш палкоўнік Самуэль Міхайлавіч, выключна рабаваньне». Проста файна, што сьмершаўцам ня стукнула ў галаву абрабаваць рэдакцыю ў духу «Хроснага бацькі» — уварвацца ў памяшканьне ў масках, пакласьці ўсіх з калашоў і, скачаўшы патрэбныя файлы з кампа, змыцца ў кірунку Нёману.

У кіраўніцтве Камітэту павінны зрабіць патрэбныя высновы з правалу апэрацыі «Ы». Перш за ўсё, нашто гэтая крымінальшчына? Існуюць тысячы адносна сумленных спосабаў разьвесьці апазыцыянэра. Мой знаёмы з «Мэмарыялу» распавядаў, што аднойчы вядомаму праваабаронцу Кавалёву янкі далі тысячу грынаў на маніторынг правоў чалавека ў Чачэніі. Аднак чачэнцы тых манітораў так і не пабачылі. На Павялецкай-Кальцавой эфэсбэшнікі пад відам кідалаў-напарстачнікаў выцягнулі ў Адамавіча ўвесь бабулін.

Цяпер пра каардынацыю працы міністэрстваў. Вось што піша сайт «Пагоні»: «У дзяжурнай часьці Ленінскага РУУС на затрыманага не зьвярталі ніякай увагі, і, скарыстаўшыся гэтым, ён выбег на вуліцу. Міліцыянты не зьвярнулі на гэта аніякай увагі. Зламысьніка зноў затрымаў Сяргей Мальчык». Проста нейкае кіно — «Уцёкі з Шаўшэнку-2». Добра, што агента не пасьпелі пасадзіць у камэру, а то ён пачаў бы рабіць падкоп. Трэ было шчыра адрапартаваць дзяжурнаму — я, такі і такі, праваліў заданьне. З кім не бывае. Славуты налётчык Рональд Бігс таксама ня зь першага разу раскудохаў паштовы экспрэс Глазга—Лёндан з двума мільёнамі фунтаў. Пачынаў з таго, што ня вельмі ўдала гопстопіў малочніц і паштальёнаў.

І, натуральна, трэба падумаць аб працы з насельніцтвам. Перш за ўсё з апазыцыянэрамі, якія думаюць, што жывуць у праватвой дзяржаве. Патрэбна сацыяльная рэкляма на БТ. Сюжэт ролiку просты: вартаўнік сядзіць у офісе «нячэснай» газэты. Стук у дзьверы. Даведаўшыся, што гэта з органаў, герой тэлефануе 02, выклікае сяброў, спрабуе даць адпор. Прыехаўшы, міліцыянты разам зь дзяржынцамі даюць усім канкрэтных зубатычын у стылі Джэкі Чана. Апошнія кадры. Раніца. Пустая вуліца Горадні. Пабітыя апазыцыянэры глядзяць, як чорная «волга» зьнікае ў вулічным лябірынце. Гучыць увэртура да фільму «Народжаная рэвалюцыяй». Слоган: «Гэта чэкісты — найлепшыя хлопцы маёй краіны»...

Пасьля сэрыі такіх ролікаў усё нармалізуецца. КДБ будзе дастаткова проста прыслаць у «День» пазоў — трэба прынесьці такія і такія файлы, а інакш павыбіваем шыбы.

**Лёлік Ушкін**



Людка Сільнова

## Газэты вясной

Вясной газэты
Шамацяць па-іншаму.
Ня гэтак,
Як, да прыкладу, зімой,
Калі ты ў пледзе,
І кампот із вішнямі
У філіжанцы
З рыскай залатой...

Вясной газэты —
Як трапечуць крыламі
Нябесныя навіны
У руках!
Ракеты,
Што ў паветры пішуць віламі
Пра шчасьце
І пра радасьць у вяках!

Прыслухайся: газэтаў шамаценьне,
Як ёсьць, займела новае адценьне.

А ўсё вясна!
Яна — пара надзеі,
Што вечныя навіны
Не старэюць!

*21 сакавіка 2004*

## ГАЗЭТНЫ ШАПІК




Самае тыражнае зь беларускамоўных выданьняў, «Настаўніцкая газета», працягвае друкаваць з працягам новы раман Юр'я Станкевіча. Папулярны пісьменьнік, які звычайна працуе ў «чорным жанры», гэтым разам прапануе навуковую фантастыку «Пятая цэнтурыя, трыццаць другі катрэн». «Квазі-кантакты з альтэрнатыўнай формай жыцьця заўсёды небясьпечныя. Клоны нерухома ўзіраліся ў натоўп...»

**АВ**

## • ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ •

Турагенцтва «Альтус-плюс» запрашае ў вандроўку, якая адбудзецца **2—5 красавіка** і мае назву **ВКЛ = Беларусь + Валынь.**

Мы наведаем Луцк (замак Любарта, сына вялікага князя Гедыміна, касьцёл Сьв.Пятра і Паўла, Траецкі сабор, Крыжаўзьвіжанская царква), Уладзімір-Валынскі (велічныя касьцёлы, цэрквы), Алыку (палац Радзівілаў), Дубна (старадаўні замак, гарадзкая брама, палацы Астроскіх і Любамірскіх, кляштары), Астрог (замак Астроскіх і царква Божага Зьяўленьня, гарадзкія вежы, касьцёл, сынагога, музэй кнігі).

Тэлефануйце: 222-88-76 ці прыходзьце на вул.Фабрыцыюса, 9.

Запрашаем на падарожжа **«Замкі Беларусі» 28 сакавіка** (нядзеля) па маршруце: Менск—Мір—Наваградак—Любча—Ліда—Ліпнішкі—Іўе—Дуды—Менск.

**4 красавіка** (нядзеля) па маршруце: Менск—Сноў—Вольна—Стайкі—Гарадзішча—Дварэц—Дзятлава—Наваельня—Райца—Менск. Тэл.: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер); 264-12-38, 8-029-776-24-35 (Павал).

**22 сакавіка памерла** сяброўка Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ **Інэса Касьцюк**. Сябры партыі выказваюць спачуваньні родным і блізкім памерлай

### ВІТАНЬНІ

**Віншую выпускнікоў** аграфаку-94 БСГА з 25 Сакавіка! З Днём Волі і Днём атрыманьня дыплёмаў (10-гадовы юбілей)! Посьпехаў вам на беларускіх нівах! Нац.

**З Днём Волі** і Дабравешчаньня, шаноўныя беларусы! Пар[учнік] БНР

**Спадару Ўладзіслаў, віншую** з Днём Волі! Зычу спакою Вашай душы і моцы Вашым крылам. Ex-Tuchka

**Віншуем Антося Карпіцкага** з двухгодзьдзем. Жыве Антось. Жыве Беларусь! Бацькі. Сваякі

**Нязломных віцебскіх змагароў** за беларускую годнасьць: Ул.Плешчанку, А.Салаўяна, Т.Мамчыц, Б.Хамайду са сьвятым днём — Днём Волі! Ад Алеся Пазьняка і Зьмітра П.

### КАНТАКТЫ

**Шаноўная пані!** Я чакаю ад Вас ліст, каб ведаць пра Вас. Шаноўны пан. А/с 39, 222160, Жодзіна

**Шукаю людзей** да 25 гадоў, якія цікавяцца містыкай або ёй займаюцца. На любой мове. 04@tut.by

**Мяняю купоны** б/а «Нашай Нівы» на купоны б/а «Звязды». 8-029-753-91-96

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Беларускія кнігі** можна набыць у суботы на «Белэкспа» (вул.Янкі Купалы, 27). Даведкі праз т: 8-029-753-91-96

**Беларускі кнігазбор.** Фёдар Дастаеўскі «Выбраныя творы», 27-я кніга праекту, сэрыя «Замежная літаратура», 672 ст. Усе новыя пераклады. Ужо ў продажы.

**Маркі з нацыянальнай сымболікай** (Крыж Эўфрасіньні Полацкай, гарады, сьцяг, герб і інш.) прадам ці памяняю на купоны б/а. 8-029-753-91-96. А/с 195, 220030, Менск

**Кнігі:** прадам ці абмяняю, дашлю сьпіс прапаноў. 8-029-753-91-96. А/с 195, 220030, Менск. Ад вас капэрта са зваротным адрасам, купон прыватнай абвесткі.

**Новыя ды рэдкія** кнігі, часопісы, дапаможнікі, слоўнікі, календары, значкі, відэа, аўдыё, CD на вул.Румянцава, 13 (ТБМ), ля Лінгвістычнага ўнівэрсытэту 13.30—19.00, апроч суботы ды нядзелі.

**Шукаю кнігу** «Берасьцейшчына» з сэрыі «Мой родны кут». Набуду ці зьмяняю. 221-21-81. Слава

### ПРАДАМ

**Ложак дзіцячы,** драўляны, а таксама какосавы матрацык. Усё ў добрым стане. Т.: 227-96-24

**Шалік, шаўроны,** значкі, павязкі, цешкі з нацыянальнай сымболікай, калекцыю аўдыё-відэа. 8-029-753-91-96

### ПРАЦА

**Шукаю працы,** маю юрыдычную адукацыю, валодаю камппутарам. 8-029-657-54-63. Мікалай

**Мастацкі росьпіс** сьценаў, дзьвярэй, аздабленьне памяшканьняў, фрэскі, жывапіс, графіці і г.д. 8-029-755-19-49. Аляксей або Аляксандар

**Цікавая, пэрспэктыўная** праца. Для ініцыятыўных, неабыякавых, шчырых, арыгінальных. 8-029-766-12-79

**Шукаю працы** ў інтэлігентным асяродку. 221-21-81. Слава

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ____________________

Імя і прозьвішча ____________________

Адрас, тэлефон ____________________

## КОШТЫ

**На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на старонку 16 рэклямныя расцэнкі:** да 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб., за кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 360 руб.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фота-рэдактар — Арцём Лява
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3529. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 26.03.2004.
Замова № 1776.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а